Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы

Зьмест кніжкі 1 (10) „Калосься“

Белар. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 1 (10) **1937 г.** **Год III**

*
* *

„Калосьсе“ пачынае трэці год свайго існаваньня. Усяго гэтага часапісу выйшла ўжо за два гады 9 кніжак: у першым годзе 4, а ў другім — 5. З гэтага бачым, што часапіс наш нятолькі выканаў намечаны плян, бо-ж ёсьць ён квартальнікам, але яшчэ выканаў яго з надвыжкай.

Што-ж жджэ нас далей, прынамсі ў сёлетнім бягучым годзе? Датрымаем слова свайму беларускаму грамадзянству, ці не? Трудна даць пэўны адказ на гэтае пытаньне. Час пражываем неспакойны, трывожны й трудна нам варажыць аб далейшым лёсе „Калосься“. Трудна й непатрэбна. Скажам толькі агулам, што за працу й у гэтым годзе бяромся з энэргіяй, запалам і з поўнай сьведамасьцяй грамадзкай адказнасьці, а як нам наша праца ўдасца, — гэта залежа ад адносінаў да нас нашага грамадзянства й ад тых варункаў, у якіх мы прымушаны валачы сваё існаваньне.

Аб мэтах „Калосься“ рэдакцыя ў кніжцы 1 з 1935 г. пісала:

„Мэтай „Калосься“ будзе гуртаваць усіх нашых паэтаў, пісьменьнікаў, а так-жа культурных і навуковых працаўнікоў, старэйшых і малодшых, дзеля супольнае позытыўнае працы на ніве роднае культуры. Адначасна з гэтым „Калосьсе“ будзе будзіць ініцыятыву да новых пачынаньняў, узгадоўваць маладыя літаратурныя сілы, ськіроўваючы ў найбольш адпаведным кірунку іхнія заінтэрасаваньні. Ставячы сабе так шырокія мэты, Рэдакцыя будзе старацца, каб наш часапіс меў характар агульна-беларускі і рэпрэзэнтаваў, па магчымасьці, усе віды літаратурнае творчасьці і тыя галіны навукі, якія зьвязаны беспасярэдна з беларускім адраджэньнем (артыкулы з галіны беларускае літаратуры, мовы, мастацтва, гісторыі, этнографіі і інш.).

Дзеля большага контакту з літаратурна-навуковым рухам наагул, у часапісе будзе зьвяртацца вялікая ўвага на рэцэнзіі літаратурных твораў і навуковых працаў, а так-жа на справаздачы з навуковага й літаратурнага беларускага жыцьця".

Узноў-жа аб гэтым самым у кніжцы 1, 1936 г. у ўступным рэдакцыйным артыкуле між іншым чытаем:

„Мэтай-жа нашай ёсьць: гуртаваць беларускія літаратурныя і навуковыя сілы, друкаваць іх творы і такім чынам прычыняцца да тварэньня беларускай культуры і пашыраць яе ў шырокія слаі нашага грамадзянства й народу. Робім-жа мы гэта, бо сьвята верым, што культура народу — найгалаўнейшая падстава лепшага ягонага заўтра".

Вось-жа запытайма цяпер, ці споўнілі мы хоць часткова тое, што намецілі ў гэтых мэтах нашага часапісу? Бязумоўна так. Лепшыя паэтычныя творы маладых беларускіх паэтаў, цэлы рад артыкулаў з беларусаведы, навуковыя зацемкі, рэцэнзіі і інш. — усё гэта гавора сапраўды аб тым, што „Калосьсе" сваё заданьне ў меру сваіх сіл дагэтуль споўніла.

А што-ж далей? Дужа проста. Далей дарога працёртая і простая. І далей пойдзем раз намечаным шляхам служэньня беларускай культуры і шляхам тварэньня яе.

Ідэовыя рамы нашага часапісу шырокія й усім, хто хоча прыслужыцца беларускай народнай культуры, часапіс гэты даступны.

Дык супольнымі сіламі да супольнай мэты!..

РЭД. КАЛЕГІЯ

Паэт

Сьвет гарыць... Патаёмна й адкрыта
Йдзе змаганьне .. Ня ўспомніць нязгод.
А над сьветам маною спавітым
Восень жоўта цьвіце, як што год.

Ты, паэце, ня відзіш пажару
Там, далёк... Ты — благі барацьбіт.
Ўсей душою у восенных чарах
Лічыш вершаў разбуджаны рытм.

Блескі сонца сачыш на аўсяньні,
Сінім змрокам малюеш палі.
Для цябе ненавісьці й змаганьні
Гдзесь за межы жыцьця адплылі!

Зімой

Абтрасьлі, разнясьлі па начах вятругі
Няжывое, пажоўклае лісьце бярэзін.
Шкляным пылам іскрыцца мароз на гальлі,
Беліць далі пустыя і мутныя сьнежань.

Замест ржавых паўтонаў асеньніх гадзін
Навакола паўсонная, белая пустка,
Ды над вострымі вежамі цёмных хваін
Шэра-сініх нябёсаў зімовая хустка.

Што зіма — я ня гледзячы, ведаю й так,
Бо ў душы маёй дзіўная мова маўчаньня.
Першы сьнег, раньні змрок мне даюцца ўзнак:
Кожны крок да жыцьця і спыняюць, і гоняць.

Не хачу я й ня ўмею пяяці зіме,
Красаваці на шыбах зімовай шыпшынай,
Пакуль холад зімовы саўсім не сатне
Мае думкі й парывы апошнія спыніць.

І жыву я зімой толькі тым, што было.
Йду між пальцамі золата восені сыпаць
І ў дадзелым маўчаньні гальля бяз лістоў
Слухаць шуму жаўцеючых, восенных ліпаў.

1936 г.

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

* * *

Не ў царкоўцы малітвай, сьвянчонай вадой, —
Ахрысьціў мяне нехта ў зялёнай дуброве.
Як паганін, я пушчы пяю залатой,
Разумею палёў васількoвых размовы.

Да мяне ня мутною вадой каляін
Падыходзіць вясна і ня сьнегам счарнелым, —
Мне сьмяецца яна жоўтым пухам вярбін,
Яснай жаўранка песьняй з палёў зарунелых.

Не сьпякотаю лета глядзіць мне у твар
І ня бурамі цьвет абівае з чарэсьняў, —
Каласістая ніва, адвечны пясьняр
Залатыя, гарачыя зносіць мне песьні.

Мне ня жаліцца восень у дробных дажджох,
У гнілых туманох на размоклым загоне, —
Мне яна павучыньне пляце ў лазьнякох
Жоўтым сном на ціхое кладзецца аржоньне.

А зіма не завеяй брыдзе на мяне,
Не сьляпою мяцеліцай сыпле у вочы, —
Над сьнягамі, на сінім нябёс палатне
Распаляе яна брылянцістыя ночы.

І заўсёды, заўсёды паганскай жудой
Мае сэрца сьціскаецца ночай зімовай.
Не ў царкоўцы малітвай, сьвянчонай вадой, —
Ахрысьціў мяне нехта ў зялёнай дуброве.

1936 г.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

НА БРУКУ

Хутка дзень заплюшчыў вочы галубыя
І над местам ночка косы разгарнула.
З песьняй чэша вецер валасы сівыя,
Вецер вольнакрылы, вецер-валацуга.

Елеск лятарняў вее шоўкаваю стужкай'
Сьцеле на каменьні чорных ценяў латы·
І людзей нямала сярод шумных вуліц,
Паплылі вясёла ў кіны, у тэатры.

Безработна з дзецем, быццам ліст сарваны,
Жоўтая ў лахмоцьці пад сьцяной сядзела,
Галаву схіліла ніжэй, як прад панам,
Хіба можа болей есьці не хацела?

І ніхто ня бачыў, як цішком сканала,
Ды нашто галодным заглядаць у вочы!
Толькі потым вецер скавытаў нямала
Сярод неспакойнай і васеньняй ночы.

* * *

Хоць адарваўшыся песьня з грудзей
Можа і сумна чагось зазьвініць —
Яж-бы хацела душу распаліць,
Песьняй гартоўнаю біць весялей.

Толькі ня знаю, чаму за вакном
Плакалі ветры у полі ўсю ноч,
Хтось праз завею паплёўся упроч,—
Пэўна ад голаду з дому уцёк.

Эх, за работай, за хлебам у сьвет,
А сілы шмат у руках маладых!
Ды невясёла праходзяць гады...
Зноў сыпле сьнегам у вочы мяцель.

Многа, ах, многа бяз хлеба людзей!
Голад адважна у вочы глядзіць.
І адарваўшыся песьня з грудзей
Часам і сумна чагось зазьвініць.

НІНА ТАРАС

* * *

Поле... межы — струны.
Ніўкі — палатно.
Рэзка вецер сумны
Б'ецца у вакно.

Дажывае вёска
Дзень сваей пары.
Заўтра на палоскі
Прыйдуць хутары.

Ні куста, ні дрэўца;
Поле, як далонь.
Ціхі сум у сэрцы, —
Сум васеньніх дзён.

Разьбягуцца хаты
У прастор, у сінь.
Будзе там араты
Сумаваць адзін.

Два гактары хутар—
Разгарніся тут!...
Ой па вёсках крута,
Сее хтосьці бунт.

* * *

Прыдарожная бярозка
Ціха з ветрам гутарыла.
— Тут была калісьці вёска
Каля рэчкі над абрывам.

Каласістыя палоскі,
Красаваліс васількамі
І хадзіла гора ў вёсцы
Сьлед у сьлед за мужыкамі.

Адшумелі каля стрэхаў
Вербы, клёны і бярозкі —
Ночкай цёмнаю прыехаў
Госьць няпрошаны у вёску.

І трывогай задрыжэлі,
І асіны, і таполі,
Распаўзьліся і паселі
Хаты шэрыя па полі.

Папаўзло і гора сьледам
У прастор палёў шырокіх
І вісіць зімой і летам
Сум над хатай адзінокай...

Беднасьць... гора... сум з бядою
Жылі ў вёсцы дружна, дружна.
А цяпер паўзе па полі
Іх удвойчы за лапцюжным.

Толькі я тут пры дарожцы
Адзінокая сумую.
І тужу з зарой па вёсцы, —
Памінаючы старую.

МЯЦЕЛЬ

Над палямі заснуўшай Краіны
Разгуляліс з сьнягамі вятры,
Замяцелілі бельлю даліны,
Карагодам пайшлі па гары.

І да вёскі з палёвых прастораў
Белагрывы нясецца прыбой.
З вішняком каля плоту заспорыў
І затрос саламянай страхой.

Лебядзіным крылом замахала
Падляцеўшы да вокан мяцель
І галодным ваўком засьпявала
Разаслаўшы ля ганку пасьцель.

Замяла усе сьцежкі і вулкі,
Наламала вярбовых галін,
Пабывала у кожным затулку
Пахаваўшы пад гурбамі тын.

Паднялася, як полым да хмараў,
Ў шыр і даль па прасторах мяцель
І гарадь вёскі белым пажарам —
І гараць, ды ня могуць згарэць.

27.II.37.

* * *

Закрыў акно я шчыльна — шчыльненька,
Глядзець на сьвет — больш сіл няма.
Над вёскай дзень — як над магільнікам.
Паўзе маркота і туга.

На дне душы — лісьцё апаўшае.
Шуршаць пражытых дзён лісты
І бачу зноў даўно завяўшыя,
І мук, і радасьці сьляды.

На нова меру шлях мной пройдзены
З сяўнёй зьвінячых зёран-слоў,
І сэнс жыцьця, здаецца, знойдзены —
На вагу дум кідаю зноў.

І зноў трывогай і пытаньнямі
Да краю поўная душа.
На песьні, песьні мае раньнія
Кладзецца сум, як цень крыжа.

МІХАСЬ МАШАРА

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

БУДЗЕ БУРА!

Навалілася ноч чорнахмарая з захаду,
Тнуць нажамі маланкі прастор,
Пад пярунам загуў, застагнаў лес ўвесь ахатам —
І патухлі агоньчыкі зор.

Будзе бура начой! Цемра — гразь непралазная
І духота і дурачы чад.
Зашапталі дубы нешта важнае, важнае —
Прытаіліся купіны хат.

С. ХМАРА

* * *

І сустрэнь мяне, о поле, шыр-прасторамі,
прыгарні і ўскалышы... Каб думы цёмныя
вараньнём над галавою ня кружыліся,
не палохалі... Няхай вецер вячэрні
іх падхопіць і нясе у далі,
на лугі... Хай па гушчах лесу
іх пагубяць, расьцярушаць змрокі...
няхай душу гордую разьверне
ніва родная перада мною —
душу, ўзрытую мукаю глыбокай,
а маўклівую — маўклівую да болі!..
Няхай водгаласы склічуцца бяздомныя
і спаўюцца хай задумаю нямою,
аж пакуль на вёску, на курганьне
чорную накіне ноч завесу...

Мо сасьніцца мне, што з поля віхры ўзьбіліся,
цемру чорную раскалыхалі —
з пад сярмягаў можа бурна ўстане
песьня —
расхвалюецца разорамі
пад лапцямі, пад нагамі босымі —
і яшчэ раз прывітае мяне поле
каласамі,
сталі звонам...
і пракосамі!...

1936.

А. БЯРОЗКА

Крыўда

I.

Змагаліся з васеньнім ветрам прыдарожныя голыя бярозы. Нібы дзівуючыся яго зьлюшчым парывам ківалі моўчкі галовамі, ды размахвалі як рукамі доўгімі галінамі. Вецер гнаў па дарозе, як стада дзікіх галубоў, падсмажаны восеньню жоўты ліст. Падымаўся ён над слупам дарожнага пылу — разьвітваўся, апошні раз можа, з сваімі радзімымі галінкамі, каб апаўшы зноў да долу — пакінуць існаваць.

Шэраю воўнаю парасло калісь васільковае неба. Вечарэла. Па дарозе з мястэчка, напіраючы на вецер расхрыстанымі грудзьмі, ішоў чалавек.

Падзёртая, мясцамі палатаная сярмяжка, расхілялася поламі, ловячы ды прыціскаючы да голых грудзей кавалкі сьцюдзёнага ветру. Хто ведае, можа спачувала гаспадару дзюравая, як яго доля, сярмяжка, можа душна было гэтым упалым высахшым грудзям... — „Што? — праіграў.. Судзіцца захацеў са мною — ды я цябе разую, разьдзену — голага пушчу"... Гэтыя словы выціскалі з галавы Мацея ўсе іншыя думкі, здавалася, што і вецер сьвішча ў вушы гэтыя самыя балючыя словы. Прыслухоўваўся: „Разу-ую"...—тоненька пішчэлі тэлефонныя драты. Безсэнсоўна пазіраў на ногі — ачадзелыя мазгі скукульваліся ў галаве, адмаўляліся глыбей разважаць. — Не — на нагах яшчэ віднеліся ўбогія атопкі лапцёў... — Ну што-ж, разуй! Многа карысьці будзеш мець, прагавітая морда! Ха, ха, ха! — неяк горка, злацешліва, быццам наносячы гэтым сьмехам сьмяротны ўдар свайму ворагу, — зарагатаў Мацей. Крыўда падступала да горла — душыла... Бараніўся, заціскаючы ў кулак, брудныя з глыбокім пісаком на адным пальцы рукі. — „Эх, сястра, сястрычка... губіш мяне, дзяцей маіх жабракамі робіш... Не, — яна менш вінна — гэта ён"... Апраўдваў Мацей сястру, робячы сабе хоць гэтым нейкую палёгку. — Ён, гэты кульгавы чорт! Мацею зноў намацалася вачыма судовая заля. Судзьдзя неяк грозна пазіраў на яго — можа дзівіўся, скуль мог чалавек дастаць такую вопратку — падзёртую, запэцканую, а лапці... — Дзяцей кармлю! — дзеці галодныя, есьці няма чаго! — хацелася крыкнуць Мацею на ўсю залю, апраўдацца перад гэтым пытлівым злым паглядам судзьдзі — кінуць яму проста ў вочы свой дакор, сваю бяду, са злосьцю. Чуў пасьля, як праз сон, прыгавар: „Палавіна зямлі і будынкаў, якімі карыстаўся Мацей Падбіты, пераходзіць як уласнасьць сястры Барбары Кумпяк"! Хацеў крыкнуць: „Ня дам! Яна гэта... ён гэта з рызыкі... яму ёсьць што жорці, яго дзеці сытыя, адзетыя"... Шукаў вачыма спогаду навакол, — людзі апусьціўшы галовы стаялі моўчкі. І паказалася Мацею, што стыдна ім усім стала, што гэтак несправядліва пакрыўдзілі яго.

Толькі партрэты са сьцяны, з нейкімі вусатымі людзьмі глядзелі грозна, як і судзьдзя, на Мацея. Выйшаўшы з суду, бачыў, як праціскаўся да яго швагер. — Ага... — думаў Мацей—сумленьне загаварыла, шкада стала... Бо і што-ж тут дзяліць — два гэктарыкі ўсяго маю — кароўка ды конік, ды нейкая кульгавая качка, як раз во, як гэты — што чыкілдае да мяне,—ужо троха вясялей падбадзёрыўшыся думаў Мацей.

— Ну што-ж! — не хацеў бяз суда абыйсьціся, па дабру, пасуседзку — ўрэшце — пашвагроўску, дык вось і маеш... — загаварыў хрыплым, грудным голасам швагер і далей наступаючы на Мацея ўжо крычаў словы, якія праз усю дарогу каралі яго, зьдзекаваліся над ім сваёю нагласьцяй. Яшчэ ўспомнілася, як рыжыя, рэдкія, нібы пасаджаныя валасіны на барадзе — стырчэлі кожная па сабе, як на вожыку шпількі; падтрасаліся ў тахту грозных слоў швагра. Далей ня памятаў добра... Злосьць і сьлёзы крыўды не далі яму нічога сказаць. Здаецца хацеў махануць кулаком у гэтую праклятую бараду — выламаць апошні зуб, што клыком пароў дзесь пад верхнюю губу. Нехта за руку адцягнуў яго.

II.

Позна ўвечары дабрыў Мацей да парогу свае старэнькае хаты. Азірнуўся. — „Хіба ўжо ведаюць тут пра маю крыўду“ — падумаў.

Шчэрачы падазроныя вочы, пустэчай глядзела на яго з-за вуглоў ноч. Трэба было абмяркаваць, як вытлумачыць жонцы усё, каб не нарабіла раптоўна лямэнту, перапужае дзяцей... Прысеў у падпавеці. За старою, прыліпшай да зямлі адрынай, нешта у гэтым глухім ветры ніто сьмяялася, ніто плакала. — „Можа гэта доля мая так скавыча“... І чамусьці прыйшоў яму да галавы зусім забыты абразок пяражытага. Хадзіў ён тады на сплаў — гналі да Нёмна па сваёй рэчцы плыты. Была раньняя вясна. Па палёх віднеліся яшчэ белыя плямы, у перамешку з жоўтымі праталінамі. У змроку вечара берагі паабапал рэчкі выглядалі вялізнай пярэстай каровай. Праз увесь дзень марасіў дождж. Прамокшыя, галодныя, зьмерзшыя—меліся ўжо прыстаць на начлег. Мацей рыхтаваў тарноўку. Плыт меліся брацъ на артоль,*) бо былі ў чыстым полі, ня было ніякага дрэўка, каб затарнаваць іншым спосабам. Раптам з галавы плыта пачуў сіплы голас свайго таварыша: „Сюды“! Не прабег Мацей і дзьвёх лавак, пачуў як са стукам штосьці затрашчэла і зноў той самы голас крыкнуў: „Уцякай — ратуйся“! Ведаў Мацей, што гэта знача, — плыт наскочыў на падводны камень. Пачало крыжаваць лаўкі, рваць ужвы, у гэткіх выпадках бывае і сьмерць. Бачыў, як таварыш яго кінуўся ў ваду... Сьцюдзёная рэчка прыняла і Мацея ў свае ня вельмі мілыя абняцьці. Выплылі на бераг. Вада ўсё яшчэ друзгатала, падкідала на сваіх ўсьпененых грудзёх, як трэску, грамоздкі плыт. Цешылася з свае перамогі, сьмяялася над мізэрнымі людзьмі плытнікамі, што выплюнула іх, як крошкі, на бераг. Серанічкі намоклі, агню было разьвясьці немагчыма.

Разважалі, што рабіць — да вёскі ня блізка... У гэты самы мамэнт, дзесь далёка, далёка, але выразна, пры ціхім вечары пачуў Мацей, як сумны, але відаць малады яшчэ мужчынскі голас пяяў: „Эх ты до-оля, мая до-оля, дзеж ты ро-одная мая-я“! Далей чамусьці перарваўшы на хвіліну канчаў: „Адгукніся, пацеш ду-ушу гарамыкі ратая-я“... Надыходзячая ноч прыглушыла хутка рэха апошніх слоў, толькі ў душы Мацея гэты ўрывак песьні пакінуў глыбокі сьлед. Няма ведама, ці доўга Мацей сядзеў-бы адзін з сваім пераглядам мінулага горкага жыцьця, але голас пад яго вакном вывеў з задумы: „На сходку! — дзе гаспадар“? — Няма яшчэ, — пачуўся ў адказ жывы дзіцячы галасок.

Відаць ня спалі яшчэ, чакалі і дзеткі яго. Вясёлая ўсьмешка радасьці забегала па дзіцячых тварыках: „Татка, татулька прыйшоў. Татка, цукерку... Татка, мне булачку! А ты мне абяцаў гармонічак купіць“... Яны не перажывалі йшчэ гора, хаця і бачылі, адчувалі заўсёды яго. Лепяталі танцуючы весела навакола бацькі. Сабраў усіх, пагладзіў па галоўках. За сэрца ціснула штосьці гарачымі абцюгамі. Ціхая балючая радасьць гледзючы на дзяцей варушылася дзесь у глыбіні душы.—„Ну, як суд?“ — запытала жонка. Маўчаў панура зьвесіўшы над сталом галаву. Зразумела ўсё... Ня пытала больш. У блядым васковым твары на мамэнт заіграў румянец. Перажывала моўчкі. Прытуляла да грудзей малыша, а на лахмаценькую яго галоўку адна за другой падалі матчыны сьлёзы.

III.

Солтыс, чалавек у сярэдніх гадох, адчыніў сход.

— Папярэджваю грамадзян зараньня, мне каб быў на сходзе парадак, не рабіць галасу.

— Ты глядзі, Прахор, скуль у яго гэткі начальніцкі і выгляд узяўся, эх — мор-рда!... — Ціха там, калі хто мае сказаць, можаце гаварыць моцна, шэптаў мне каб ня было, а перадусім трэба прасіць слова! Дык вось ёсьць такі наказ з воласьці, каб сабраць на фундуш дзяржаўнае абароны па два кілі з гэктара жыта, хто ня мае жыта — хай плаціць грашыма, бо... — Што бо? — гаварыце, нас пужаць няма чаго. Напужаныя. Што я дам, галава твая міністэрская, сам-жа ведаеш — купляю...—Тут прымусу няма, даецца з добрае волі, але... — Дагаварвай, пане сол-

*) Даўгі завостраны кол з прывязанай тарноўкай, вылезшы на бераг гэты кол трымаючы стырчма чапляе за зямлю, паступова стрымоўваючы плыт.

тыс, дагаварвай. Мікіта бач разявіў рот па самыя вушы, выскажы ты яму, што ў цябе пад гэтымі *„бо“* ды *„але“* захована!

— От, ня ведаеце, — навінчвае гайку, выслужываецца. — Я-б нават даў, — адазваўся з-за печы стары Цімох, пазычыў-бы, а даў-бы — можа падатак даравалі-б... — Ха, ха, ха, — загуло як у пчаліным вульлі ў солтысавай цеснаватай хаце. — Дзядзька Цімох сказане заўсёды.

— Ціха! Няма чаго тут жартаў строіць, парадачны чалавек гэтак ня скажа, хто мае што сказаць, хай просіць слова, а то — аштрафую...— Пане солтыс, прашу слова,— азваўся з клінаватай пасярэбранай барадой былы царскі чыноўнік.

— Гаспада! Мамэнт „очень“ важны. Я тут вам „декламировать“ падробна ня стану, — скажу только адно: за царом бацюшкай „всякое сопротивление власти“...

— Даволі, даволі, ратуйце ката, кот душыцца ад слёз! — Дзядзька, дзядзенька, павошта гэтак жаласьліва гаварыў. — Ты Мітры ня сьлінь, таксáма-ж з цябе баба. — Не магу, браткі, за самае сэрца шарпануў, дальбог не магу, запомніў я яго грэшны зусім, аж тут раптам: „цар бацюшка“... Усё нутро распаліла...— Ха, ха, ха і бізунчык пэўне спомніў — што?... — Ціха! Ці ўрэшце вы лічыцеся з солтысам, ці не? Больш паўтараць ня буду. Я бачу — якраз усе тыя, хто зусім ня плаціць падаткаў, да каго так любіць часта заглянуць сэквэстратар, адмаўляюцца даць дапамогу — так і запішам... Пішы, браце, пішы — папера не пачырванее. — Пане солтыс, трэба разьбірацца, хто ня хоча, а хто... Го, го, абразіў солтыс чалавека. то-ж Кумпяк можа заплаціць, павінен на’т барышу паставіць — ён сяньня швагра асудзіў. Нарасьце на Кумпяку яшчэ трохі сала. Смактануў крыві з чалавека.—Пакінь, Рыгор,— памылку маеш — крыві ён не смактануў, бо ў Мацея яе няма, — сухі як шкілет, — шпіку з касьцей, можа быць, — праўда Мацей! — Браткі загінуць прыдзецца — пакрыўдзіў ён маіх дзяцей... аб сабе я не гавару... вытрымаю можа да тае пары, каб памсьціцца... Хай ня думае, жывадзёр, — вешацца не пайду... Браткі, дзяцей шкада — пяцёра... чым яны вінныя? Галодныя сядзяць. Кароўку маю — прадаць трэба —прасудзіў... Браткі, ня дайце дзецям загінуць.—Сорам, Кумпяк, — ці палезе табе ў пражорнае горла кавалак хлеба, — чуеш, што твой швагер гаворыць! Сорам, нашоў у каго... — Хлопцы. Грамадзяне, дайце сказаць... — Эх ты юдаш! Грамадзяне, прашу слова. — У солтыса прасі, а то абразіцца... Солтыс чалавек ня наш, а хто яго выбіраў, хай той просіць слова. Ціха! — дайце Пятруку „рэч“ махнуць. — Гавары! — Хлопцы, я сваю ахвяру на першы раз, што з мяне належыцца, як сказаў наш пан солтыс, па дзьве кілі жыта з гэктара, даю, як дапамогу Мацеевым дзецям...

У хаце солтыса запанавала цішыня. З натоўпу выляцеў нечы раптоўны цяжкі ўздох. Мацей затуліўшы далонямі вочы, згорблены, прыціснуты відавочным цяжарам, сядзеў у парозе. Хітрыя вочы солтыса раз стрэльнуўшы злосьцю ў прамоўцу, уткнуліся зноў у разложаныя на стале паперы. Мамэнт быў напружаны. Пятрук гаварыў далей:—Да гэтага яшчэ дадаю ад сябе кошык бульбы і паўгарца круп. Заўтра, Мацей, можаш прыйсьці па сваё належнае. — Брава, Пятрук! Вось дык сказануў, я гэта ўвесь час думаў, бадай цябе — вырваў нібы з вуснаў словы, — я таксама даю...— І я!— І я! — пасыпаліся з натоўпу выкрыкі. — Пятро, запішы ўсіх, хто дае дапамогу Мацею... — Не, гэта зробіць солтыс. Гэта рэч грамадзкая і ён мусіць зрабіць! Пане солтыс, запішы... — А вы багацеі, што-ж маўчыцё? Шкада бульбы кошык даць...паску-уды!— Не чапай іх, Рыгор, яны ўжо няхай даюць у другое месца — крыўды ня будзе, бо нейк і сорам ім было-б зьліцца з—„пралетайламі“, як яны нас называюць. Урэшце азваўся Мацей: Браткі... хачу падзякаваць вам усім, хто... — Пакінь, Мацей, падрастуць дзеці, яны падзякуюць, можа наша табе дапамога паслужыць прыкладам для многіх, як трэба ратавацца, каб жыць, а не загінуць.. Няма нам на каго спадзявацца — пакінь...

Неяк загадкова скрыпелі дзьверы солтысавай хаты, выпушчаючы па некалькі чалавек са сходу людзей. Сьцюдзёны васеньні вецер выскакваў раптоўна з-за вугла ды выдзьмухваў з вопраткі несенае з хаты цяпло, пасьля мкнуўся дзесьці ізноў з сіплівым сьвістам хаваючыся ў цёмным бязданьні. Пахла глухою поўначчу.

МІХАСЬ ВАСІЛЁК

* * *

Я пытаўся у варожкі
Пра сьцяжынкі, пра дарожкі—
Да цябе.

Я пытаўся у варожкі,
Ці кахаеш ты хоць трошкі
Ты — мяне.

І сказала мне варожка,
Кінь пытацца пра дарожкі —
Да яе.

На сьцяжынках, на дарожках
Не сумуюць яе вочкі
Па табе.

Не сядзі ты познай ночкай
Пад акном.
І ня снуй ты думкі горкай
Палыном.

Не глядзі у даль нямую —
Ў змрока-муць.
Што прайшло, таго ніколі
Не вярнуць.

М. МАШАРА

НАРАЧ

(Частка пятая)

1.

Сосны зялёныя,
шумныя сосны!
Тонуць у небе густыя вяршыны.
Ў ночы сасновыя дзіўныя кросны
ткуць па азёрнай ўсхвалёванай сіні.

Вецер з шырокіх паднебных аселіц
хмары, як сена, зграбае у копы.
Сьпяць баравыя забытыя тропы,
чорныя пацеркі ліча яленец..

Вочы памые зара — чараўніца,
поглядам спаліць крылатыя бровы,
доўга тады дагараюць зарніцы
мокрай расою на шышках сасновых...
— — — — — — — — — —

Берагам цягнуцца хаты — палацы,
шыбамі топяцца ў сініх азёрах;
ясна глядзяць на далёкія горы
нівы у золаце сонца гарачым.

Неба пасьцілкаю сьцеле далёка
шэрую долю і зрэбныя вёскі,
ціхі магільнік стары, адзінокі
з вечна сумуючай вербай, бярозкай...

Людзі жывуць у палацах другія, —
хлеба ў іх досыць і хлеб без мяккіны —
глыбака ўгрызьліся ў плечы Краіны,
ўпіліся п'яўкамі ў рукі худыя.

Толькі затое ўвесь бераг рыбацкі
летам і восеньню мыецца потам,
мыецца горка сьлязамі сіротаў,
плечы мазоліць век лямкай батрацкай.

Нават і песьні там іншыя, неяк, —
звоняць яны сіратліва над полем,
сумна хвалюючца скаргай жалеяк, —
можа сумуюць па шчасьці, па волі?

Толькі часамі падымуцца горда,
сьлёзы атросшы, другія напевы;
поўныя сілы, размаху і гневу
бунтам ударань жывыя акорды...

2.

Выйшлі...
Праз межы і поле
з вёсламі, з сеткамі бурна ішлі...
з берагу кагарак стада
ціха паднялася,
зьнікла
ў далі...
Лодкі ярцелі спусьцілі.
— Сьмела ў дарогу!
— Шчасьлівы палоў!
— Помніце: хлеб ужо выйшаў... —
сыпнуў тлум жменяй густых галасоў. —

З Нарачы выплыла сонца;
шэрыя лодкі на сонца плылі;
біліся хвалі аб вёслы
і пераліўна і шумна цьвілі.
З берагу бабы і дзеці,
гурбай на бераг прыйшлі старыкі, —
з вёсламі, з віламі вёска. —
Вочы спрагнёна глядзяць з пад рукі.
— Што...
другі бераг...
ня выплыў...
— вёска нічога ня зробіць адна.. —
Сінія хвалі шапочаць...
Сьціснула за грудзі тлум цішыня.
Моцна вачамі сівымі
ўпіўся у бераг далёкі Сымон...
Сінь безгранічная ўсюды...
Пеніцца хваляў сівы перазвон...
— Кагаркі можа...
ці лодкі?...
Гатаўскі, бачыце, бераг ажыў! —
Бліснулі радасьцю вочы,
быццам на твары
хтось сонца разьліў.

— — — — — — — — — —

Люблю твае, Нарач, затокі і тоні,
як вецер густыя туманы разьвесіць,
ці пена срабрыста на хвалях зазвоніць
цалуючы зоры, калышучы месяц.

Люблю, калі ў сонцы гараць пазалотай
раскінуўшы сінія хваляў палотны,
ці шэрымі днямі сумуеш маркотна
з рыбацкаю песьняй,з зялёным чаротам.

Люблю твае буры, твае навальніцы, —
ў іх чую, як ў песьнях, жыцьцё маладое...
і хочыцца блізка грудзьмі прытуліцца
да чорных ад гневу магучых прыбояў.

3.

З прыстані, лукам мінаючы востраў,
на перарэз рыбаком,
лодка маторная пеніцца востра, —
птушкай ляціць на пралом.

Шырака стадам згуртованым, шэрым
лодкі плывуць рыбакоў.
Бурна шуміць разшумеўшыся бераг
морам людзкіх галасоў:

—Рана-ткі сяньня прачнуліся, гады!
— Бачыш,—ляціць вартаўнік...
— Трэба было-б яму плечы пагладзіць
лодку загнаўшы ў трысьнік...

З возера вецер прынёс адгалосы.
— Эх, закіпела ў далі!...
— Вернуцца сяньня. . . . . .
— Вёслы ў работу пайшлі!

З вёскі, ў сярмязе расхрыстанай, шэрай,
быццам варона ляцеў
полем да возера солтыс Цяцера.
— Рыбы відаць захацеў!?

—Што там? Кажы! Чаго ліхам прыпёрся?..
— Ў вёсцы стражнікаў шмат!...
І галасы, быццам жнівам калосься,
зрэзаў нахлынуўшы град...

Возера толькі калышыцца шумна,
б'ецца у бераг, шуміць.
— Бачыш, ідуць ярыною, праз гумны...—
будзе з дзесятак . . . . .

Змоўклі... Цясьней толькі плечы зьліліся,
глянулі . . . . . ў твар.
Сяньня вазёры, відаць, падняліся
бурай аддаць за удар!

— Хто вас тут склікаў?
— Ніхто, прыйшлі самі...
— Слухайце, вы, рыбакі!
Сеткі аддайце!. . . . .
. . . .

Сымон

Ты нас ня страш, ды яшчэ ты за молад,
не напужаеш . . . .
тых, што ўжо бачылі войны і голад,
тых, што жывуць палыном.

. . . .

тлум ускалыхнуўся, замёр. —
Можа вам зсечанай сосной дарогу
загараджу да азёр!...

Грышка

Не, не табе, стары, з імі спрачацца,
лезьці грудзямі на іх!
Хопе . . . .
сілаў у нас маладых!

Рыбачка

Сьвет завязалі галодным сіротам! —
Чым мы накормім дзяцей?!
Доўга і так бядавалі гаротна!
. . . .

Тлум пахіснуўся, як мора жывое,
з мейсца пайшлі рыбакі
. . . .
. . . .

Шырака сьцелецца возера шумна,
іскрыцца пенай, гарыць. —
Сінімі ўзмахамі вецер на струнах
песьняй зялёнай зьвініць.

Сонца ліецца ў далі пазалотай,
тлее начлежным агнём,
дзень дагарае за сінім чаротам
кагаркі белым крылом.

4.

Запелі дзяўчаты
і ў лесе сасоньнік,
на прызьбе пад хатай
заліўся гармонік.
„Ой жыта я жала“...—
і песьня, як золак,
напевам вясёлым
збудзіла цымбалы.
Праз межы, загоны
ў даль рэха няслося,
дзе звонам зялёным
зьвінела калосьсе.

Аб чым струны пелі?
Ёсьць песьняў нямала!—
і вёска мяцеліць
пад гоман цымбалаў. —
Аб тым, што мо' ў полі
сумуе рабіна,
варожа дзяўчына
з калосься аб долі...
І струны гавораць,
то пеняць віхурай
аб нашых вазёрах
ўзбунтованых бурай.

Тацяна

Што-ж, пэўна ня жыць нам,
я ведаю, разам
і сяньня у жытнім
калосьсі дзяразай
сум грудзі сплятае.
Ты хутка пакінеш
азёраў краіну, —
цябе ўжо шукаюць...
Мо прыйдуць на зьмену
другія тут людзі
і кагарку пэўна
сваю ты забудзеш...

Грышка

Хтось ходзе за намі, —
я даўна ўжо чую. —

Хтось ходзе начамі
і днямі пільнуе...
Свой, пэўна, вясковы...
Нічога, Тацяна,
ня возьмуць за танна
рыбацкіх галоваў!
Адно толькі горай,
што раніцай сіняй
цябе і азёры
я мушу пакінуць.

Мо' сьцежкаю польнай
з шляхоў Беларусі
калі-небудзь вольным
да вас я вярнуся.
Вярнуся па шчасьце, —
ды можа за позна —
як серп на барознах
снапы будзе класьці.
Прыйду — не пазнаеш.
Успомню сустрэчу,
успомню, таварыш,
пра сяньняшні вечар.

Я зроднены з тымі,
што век жывуць працай,
што ўсталі стальнымі
радамі змагацца.
І дзе заўтра лягу,—
ня ведаю сяньня, —
ці вып'ю сьвітаньня
вясеньнюю брагу...
З тугою ня трэба
ісьці у жыцьцё нам!...
Глянь — сыпецца з неба
зара цьветабоем! —

Залоцяцца хваляў
густыя пакосы,
а цені ўсё далей
зжынаюць калосьсе.
На бераг пакаты
схіліўся сасоньнік,
цалуе гармонік
дзесь песьню дзяўчатаў.
А вёска мяцеліць
і рэха ноч цешыць;
палотны аселіц
расой беліць месяц.

5.

Як стада спуджаных коняй,
вецер таптаў капытамі
ночы ваўністую цень,
рваўся туды, дзе за азёрныя гоні
з вечарам сінім адходзе з вёсак саломенных дзень.
Заснулі зморана хаты,
толькі ў таку не заснулі...

Грышка

Што, ужо сьпіш ты, Прахор?
Доўгая ноч...
Пагаварыць-бы нам варта...
Нeяк шкада пакідаць мне Нарач і вёску і бор...

Прахор

Вось ноч!...
Ўсё брэшуць сабакі.
Вецер на сена залазіць, рве з узгалоў'я пласты;
спаць не дае, ходзе і поўзае ракам...
Кажыш: ня сьпіцца?—Ня думай. Хутка засьнеш тады ты...
Можа нарве непагоду.
Чуеш, як шчытам калоціць?Ноч завывае, як воўк.
Рана зьбіраешся выйсьці?

Грышка

Рана, яшчэ да усходу...
Што-ж абарваў, не гаворыш, – неяк раптоўна ты змоўк?
А я ўсё пра азёры
думаю. Прыдзецца можа брацца няраз за калкі,
каб адагнаць сілай рыбацкае гора,
каб ня ўпушчала у грудзі болей стальныя клыкі!..
А ты, Прахор?... Можа дрэміш?

Прахор

Не. Гавары!...
Неспакойна вецер па хустках бяроз
крыльлем шуміць, зораў арпуючы семя.
Цягне мядзьведзіца ценяў кудлатых абоз...

6.

Вартаўнік

Але і цёмна!

Месяц, як камень апаў на азёрнае дно.
Хіба ўжо поўнач
даўна мінула... Зара, быццам певень крылом,

хутка па стрэхах
спудзіўшы цені начныя зазвоне.
Дрэвы, як вехі,
чорныя мераць заснуўшыя гоні.

Першы стражнік

Добра ты помніш?
Нас толькі не завядзі у другое гумно...

Іван

Я, пан, як польны
заяц, так ведаю, дзе які лубіну сноп —
кожную хату...
Гэта зямлянка Рыгора старога...
Чорныя латы
вецер саломы разнёс па дарогах.
Далей Сымонаў
плот хату гнілую ад ветру плячамі падпёр...
Далей загоны...
Вось і гумно... Не адзін пэўна ён... з ім Прахор...

Другі стражнік

Што-ж затрымаўся?
Першы раз... посьле набудзеш ты гарту.
Можа спужаўся?

Іван

Думаю, з вамі ісьці мне ня варта.
Каб і было што...
Я сваё скончыў, пайду...

Трэці стражнік

Так, ты можаш... Ідзі!...

Іван

Пойдзеце проста.
Сяньня ўсё вецер, пан, вецер заглуша адзін...
Толькі азёры
выплясуць сінюю раніцу бодра,
дзень на разоры
вынясе золак, расплёскае з вёдраў.
Вёска устане,
схопіцца пэўна . . . .
Але Таццяна?...
Міласьць зарой адцьвіце мо' і перагарыць...

Вось яе хата...
Посьле зайду... Нехта крыкнуў здаецца...
Можа з кудлатай
вербай так вецер шуміць?... Пэўна вецер...
— — — — — — — — — —

Тацяна

Тата, ня сьпіш можа, тата?
Крокі пад вокнамі чуеш цяжкія?...
Сяньня сабакі на вёсцы
безперастанку ўсё выюць і выюць...

Сымон

Можа ваўкі падыйшлі дзе.
Возера з ветрам удужкі ўзялося?
Сьпі! Зараз хутка устанем.
Можа табе гэта толькі здалося?

Тацяна

Я лепей выйду і гляну, —
толькі ускіну на плечы вось хустку...

Сымон

Сьпі, бо нічога ня ўбачыш...
Сьпіць яшчэ вёска, на вуліцы пуста...
Выйшла... Ня сьпіцца ей нешта.
Мо' і замоцна шуміць сяньня Нарач...
добра ня чую...

І хрыпла
сон пакаціўся па дошчатых нарах.

7

Тацяна

Што тут? Гумно адчынена... сена
вецер мо' ўсё паскідаў гэта з вышкаў...
Пэўна хтось быў тут.
Грышка, пара уставаць!... Грышка!!.
Грышка!!! —

Шумнымі ўзмахамі крыльля
вецер ударыў у твар і далёка
дзесь зашумелі
з крыкам сасонкі ў бары над затокай.—

— Грышка!...

Іван

Тацяна!.. Больш ён ня прыйдзе...
Можа ня верыш?—Пайшоў на гасьцінец
разам з Прахорам.
Слухай, Тацяна: цябе ён пакінуў,
болей ня прыйдзе, ня прыйдзе!.

Тацяна

Але чаго ты прыплёўся?

Іван

Я?... блізка
быў тут... із справай...
посьле пачуў, як ты клікала Грышку...

Тацяна

Не! ня трымай! Пусьці!

Іван

Эх, як птушка
вырвалася, паляцела. Ей-богу,
пэўна падыме
сонную вёску, арцелі на ногі...
Трэба хавацца, ўжо днее...

Невадам чорным зьбірае ноч зоры...
цягне на захад,
з ветрам на захад
у даль,
за вазёры...

— — — — — — — — — —

Гэта ня бура калоце лясы.
Быццам пажарам у шэрую муць
з рэйкі сарваўшыся звон—галасы:
б'юць, б'юць
і б'юць,
быццам у грудзі ўбіваючы цьвек.
Востра, як ножам крылаты узмах
вёску
і вецер
і ноч перасек.

Роіцца тлум рыбакоў. Бусакі
вырасьлі лесам асеньнім ў гару;
медная трывогі — агні языкі
ліжуць зару...
— Што, чаго звоняць? — нясецца з далі.
— Дзе іх пагналі?
— Хто бачыў?... Куды?!
— Трактам кабыльніцкім іх павялі!..
Звонам Тацяна калыша народ.
Часам здаецца ей: людзі маўчаць,
ў грудзі ліецца гарачы усход,
сьлёзы зьвіняць...
Бурнымі хвалямі ў поле з сяла
выпляснуў грозны рыбацкі натоўп —
чорная хмара зямлёй паплыла...
Ў сонцы пажарам гараць трысьнікі;
ветры загоны азёраў аруць,
толькі трывогі стальныя клыкі
рвуць
даль,
зару.

(Канец часткі пятай).

Вільня, 5.XI. 1936 г.

Мастацтва

Студэнт мастацтва Яканюк сядзеў на высокім услончыку ў сваім пролетарскім атэльле. Прыжмуранымі вачыма пазіраў у вакно. Шэрыя змрокі не давалі працаваць. Яны цёмнай патакай пакрывалі абразы, разьвешаныя на сьценах. Мастак нярухома сядзеў. Яго сілуэт быў падобны да статуі: змучаны падарожны супачыў на прыдарожным камні. Здавалася, мастак драмаў. Ён, аднак, далей маляваў. Там, на фоне шэрых дамоў, што паўзьлі геомэтрычнымі лініямі ў вакно, укладаліся нейк асабліва колеры, застыгалі плямамі й рассыпаліся ў зрочны пыл. Там жыў яго вобраз.

Яна! Адно слова. Але ў ім столькі незразумелае красы. Столькі сіняга неба. Столькі вясеньняе зелені. Вось, як-бы абсыпаны ён цьветам яблынным, стаіць на зары свайго расьцьвету, зьліжаецца да разуменьня нейкае тайніцы жыцьця і мастацтва. Як-бы ішоў і спаткаў некага. І, здаецца, убачыў новыя далі, павабныя й прасьветлыя. Звычайная гісторыя, і выткалася яна такімі-ж шоўкавымі зрокамі. Адноўчы.

Наняў ён, студэнт Яканюк, пакой. Гаспадыня — сама-ж і дамаўласьніца. Мае каўбасьню ў партэры. Няцікавая баба. Таўстая, засаленая. А пакой — таксама няцікавы. Такая проста недарэчнасьць. Падвал — не падвал — сырая развaліна. Адно, што спадабалася — вокны. Вялікія вокны. Удзень—сонца напіцца. А вечарамі — вялікія сінія шторы. А за домам — сад. Выбегчы крыху — абрыў. Пяе места ўвечар, і раскацістымі гармонікамі адбіваюцца недзе ў хмарах — гулкія рэхі.

У каўбасьню часам забяжыць мастак. Каўбаскі некалькі дэкаў. На дэкі купляе. Пры ўваходзе заўсёды пры дзьверах забражджыць шалястунчыкам званок. За прылаўкам — гаспадыня таўстая, а ля яе дачку часта бачыў. Маладая такая, прыгожая — лятуценьне! І неяк іх вочы спаткаліся і ўпала ад іх блеску іскрачка ў сэрца. Кожны раз, як прыходзіў, яна чырванела сьпеючай вішняй.

— Мама, не фатыгуйцеся — казала. — Я сама...

Можа й няцікавыя гэта былі словы, але мастаку яны пераліваліся крынічна. Дый ён ня чуў, а бачыў. Ня цікавіла яго добрая перавага, якую, нібы ласку, давала, зьнімаючы лоўка з нажа нарэзы каўбасы. Раскідаліся пышна сьветлым ліпнем валасы яе, туманіліся ў попеле яе вочы іскрамі, падымаліся й ападалі хваляй яе грудзі дзявочыя. Замуціўся сон мастака, і шалясьцелі думкі ў цішыні. Прыходзіла яна ў снох, прыходзіла з цёмнай далечы, асьвячала сьветазарнай яснасьцю. І бліжэй, і бліжэй ён быў да мастацтва.

Звычайная гісторыя...

Пасьля ён ня стрываў. Зазваніў раз шалястунчык — званочак. Яна была адна! І ня памятаваў, ці сказаў ён, ці падумаў голасна:

— Я-б хацеў вас намаляваць. —

Загарэліся словы. Спалохаўся — ці споўніцца сон. —

— Ці дазволіце... Я-б вас вельмі прасіў... Вы-б добра выйшлі — дадаў.

Заірдзелася, як звычайна, сьпеючай вішняй і нясьмела прамовіла:

— Я спытаюся мамы. —

Пачуў усю прыкрасьць яе словаў. Нялоўка стаяў, калі важыла нейкаму кліенту. Такі марудны здаваўся ён сваімі рухамі, такі нязносны пытаньнямі.

— А гэта, выбачайце, колькі каштуе? — і пальцам торкаў у пакрыўное шкло. Не сьпяшаючыся, абрахоўваў, дзяліў цану на дэкі, паволі, так паволі, як-бы ён меў прад сабой 1000 гадоў жыцьця.

Назаўтра яна прыйшла да яго. Ціхенька пастукала і ўвайшла ў пакой. Шоўкам шалясьцела яе сукенка. Шэлест зялёных лістоў за вакном? Мастак пачуў павеў вясны ў сваёй маўклівай кельі.

— Ведаеце, мама не пазволіла. Але я прыйшла. Сказала, што йду да прыяцелькі. —

Засаромілася, апусьціла вочы.

Мастак зьбянтэжыўся. Але хутка мальбэрт стаяў на мейсцы. Ніколі так не працавала рука, ніколі так ня жмурыў вочы. У галаве лёгка кружылася, нечага дрыжала цела, а пэндзаль нэрвова стукаў.

Ужо сьцямнела, і ў пакоі ляглі сьветлымі кацянятамі водсьветы вуліцы, і партрэты ўрасьлі ў муры сьценаў. А мастак нярухома ўсё сядзеў. Думкі цягнуліся павольна неразрыўнай ніткай.

— Старыя мастакі, пэўне, ведалі нейкія асаблівыя мешаніны хварбаў. Прыпамятаваў старыя абразы ў Беларускім Музэі.

— А для яе валасоў не хапае нейкай хварбы. —

Як у поэта часам слова не хапае. —

Шэрая раніца — матавае шкло. Мастак абшукаў усе кішэні. Ані паламанага грошыка! Схапіў шапку і выйшаў на вуліцу. Ужо дзевяць. А ў дзесяць павінна прыйсьці яна. У каго-б тут раздабыць грошы? Вуліцы ідуць насустрэч мастаку, думкі выстуківаюць прозьвішчы знаёмых.

— Ага! Удава — дохтарша яшчэ вінавата за партрэт. Можа там. —

Жорсткім пяском сыпнулі словы служанкі.

— Пані няма ўдому. — Выехалі на вёску. —

Аслупеў.

— Выбачайце, а ці не пакінулі?... Я — не — нічога. Што-ж? Пастаяў на сходах, глянуў у пралёт паваротаў і, раздумываючы, пачаў саскоўзвацца пастудэнцку на парэнчы.

А мінуты бягуць хуткім маршам. О, ужо палавіна дзесятай. Зараз дзесяць гадзін. І яна прыйдзе. Пабачыць — яго няма. Разгневаецца за неакуратнасьць. І разьвеецца яго сон.

Антон, стары унівэрсытэцкі сторож, пазычыў залатоўку. Ён неяк зразумела пабацькаўску ўсьміхнуўся і сказаў:

— Ведама, трэба жыць. А панок мне аддасьць, вядома.

О, Антон добры чалавек. Памятнік паставіць такому чалавеку.

Пот ліў градам з мастака, калі прыйшоў. Кінуў шапку, выцер пот рукавом. А можа ўжо была? — Заблукалася пытаньне. Але разводзіў хварбу, дамешваў. Спрабаваў на палатне. Цяпер, здаецца, залаціста раскінуцца валасы. Мастак адыйшоўся, трымаючы на вялікім пальцы кружок з хварбамі. Прыжмурыў вочы. З палатна сьмяялася да яго прыветна дзяўчына. Ён назаве абраз — Вясна. На выстаўцы — першае мейсца. Слова. Напружаная праца. Парыж! Оювр!

І калі так думаў, паволі адчыніліся дзьверы і ў пакой увалілася таўстая каўбасьніца. Яна зьмерыла мастака пагардлівым поглядам і абрывіста, задыхаючыся, сказала:

— Дачка мая ня прыйдзе вам тут выкрыўляцца. Яна з „парадачнай“ сям'і, і вы выкіньце з галавы свае рамансы. Я не дапушчу, каб маю дачку псавалі розныя там студэнты.

— Але-ж я... — хацеў апраўдацца.

— Вы — нічога — абураная абарвала гаспадыня. Голас яе падымаўся вышэйшымі нотамі. — Я не хачу толькі скандалу падымаць. Дачку шкадую. Але хай яшчэ раз паўторыцца гэта — у паліцыю пайду, у унівэрсытэт пайду. — Каўбасьніца, цяжка дыхаючы (у яе была астма), выйшла. Дзьверы захлопнуліся, а яшчэ чуў абрыўкі цішэючага крыку. Мастак, як стаяў, так і сеў на ложку. І доўга сядзеў нярухомы, акамянеўшы.

— Падслухала, сьцерва! — злосна, з сыкам прашаптаў ён.

Думкі плылі абрыўкамі. І чамусь успомнілася яму, як ён, яшчэ на першым годзе, ня маючы грошы на білет, ехаў на паравозе з машыністам у родную Слонімшчыну. Вось ён стаіць, у парваным пальце, на пэроне. Машыніст пушчае дым з папіросы й сьмяючыся пытаецца:

— А маеш легітымацыю?

І нашто так цярпеў, нашто недаядаў! — Мастацтва! Чорт вазьмі! Мастацтва! Мальбэрт сумна стукаў ад удараў пэндзля. А ў мастака ўсё больш нарастала злосьць і праклёны калолі палатно. Хутка з партрэту зрабілася нейкая мазьня, як сьвежыя соты. Кінуў палатно ў кут. Змораны, ізноў сеў.

— Каўбасьніца! Цьфу! — Чорт! Халера! Мяшчанства! — лаяўся мастак і, седзячы, тупа глядзеў у падлогу.

Вечарам яна прыйшла да мастака. Ня стукалася, як раней. Ціха падыйшла да яго ложка, дзе ён ляжаў. Правяла рукой па чупрыне і спытала:

— Ты гневаешся на мяне? —

Мастак шырака разчыніў вочы й ня ведаў, што сказаць.

М. ДАЛЬНЫ

НІВА.

Прысьв. ЯКУБУ КОЛАСУ

Была ніва несчасьліва,
ў сонцы млела, дзірванела.
Людцы плакалі сардэчна,
Наракалі векавечна —
Сын зямлі кляў ніву ўласну.

Дзеці бедныя — галодны,
Браты родныя — нязгодны;
Сонца вельмі неласкава,
Доля-шэльма няцікава
Людзі ўпалі ў роспач страшну...

Эх, панура сьвішча бура;
Град ляскоча, выбіць хоча
ўсё насеньне, ўсё карэньне
ўсю надзею Адраджэньня —
Гэй, Краіна ўся загіне!...

Так ня будзе — знайце, людзі!
Бо зярняткі з зямлі-Маткі
Сталі ўсходзіць. Слава, слава!
Сьвеціць сонейка ласкава —
Радасьць йдзець па ўсей Краіне.

Чуем голас: „Вырас КОЛАС!"
На Купальле плывуць хвалі:
Гдзе загон быў зьдзірванелы,
Цьвіце КОЛАС скорасьпелы,
Ураджай вялікі будзе!

Вецер дыша, ўжо калыша
КОЛАС важкі, зернем цяжкі:
Шуміць КОЛАС, аж іграе,
Салавей уторыць ў гаі —
Зьвесялелі сумны людзі.

Сонца — ясна — ў цень заходзе;
Бура — страшна... не зашкодзе!
Завыў вецер, віхор сілен:
Жыве КОЛАС, хоць прыхілен—
Пара буйны КОЛАС жаці.

Як на небе зоркі ясны,
Як на ніве кветкі красны, —
Так разсыпаліся дзяўчаты,
Хлопцы з імі. Плён багаты!
Жніво — бітву пачынаці!

—о—

Блішчаць росы, сьвецяць косы;
Каса звоніць, серп гамоніць —
Жыта, жыта!...

—о—

Мілы Божа, радзі збожа!
Каб мы з песьняй жыта жалі—
Сьвет красою чаравалі.
Каб на тым пустым папары
Расьлі Танкі і Машары;
Каб Наталкі і Бярозкі,
Васількі, як Божы сьлёзкі —
Нова буйна ПАДКАЛОСЬСЕ—
Расьцьвіло і налілося,
І зрадзіла плён паважны.
Хай жывуць!...

ВІНЦУК АДВАЖНЫ

Вільня. 13.XII.1936.

НАТАЛЬЛІ АРСЕНЬНЕВАЙ

Твая душа сатканая
З вясёлак і зарніц,
і песьнямі скупаная
вадой сямі крыніц.

У чарах дум замкнутая,—
дзе лёг дарожны шлях, —
цьвіціш пахучай рутаю
гарыш у верасах.

З душою заварожанай
Спакоем і красой —
Ты песьню сваю кожную
Даеш людзям жывой.

Хоць Ты і адарваная
Цяпер ад нас жыцьцём;
Ты з намі расьпяяная —
Душой і пачуцьцём.

Дачка Радзімы шчырая,
і там ў сям'і чужой
Ты служыш звонкай ліраю
Краіне Маладой!

М. МАШАРА

Студзень. 1937

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

НАШЫ ШЛЯХІ

Прысьвячаю НАТАЛЬЛІ АРСЕНЬНЕВАЙ

Нашы дарогі расходзяцца даўна пад зорамі.
На аднэй чуеш крок, на другой— шум трысьця...
Не спаткаліся тут між палёў, між разорамі.
ня сустрэцца ім на пяшчаным парозе жыцьця.
Будзе сонца гарэць...
Паясом слуцкім песьня Твая мо' рассьцеліцца.
Наша — будзе чарнець, як чарнее рубцамі далонь,
там, дзе вецер калосьсямі будзе шумець і мяцеліцца,
дзе на нівах бяз меж палыхне ураджаю агонь.
Сяньня песьня Твая расьцьвіла зачарованай казкаю, —
а мы казак так даўна ня чулі ў жыцьці! —
ўсё ідзём каляінай нікім не пратоптанай, гразкаю;
нам ня можна вярнуцца, а трэба наперад ісьці!
Нашу песьню няраз грызьлі голад з сухотамі,
ня было нават ранаў калі загаіць.
Станавіліся, ведай, на грудзі падкутымі ботамі
і чужынец-гандляр, а найгорш гэта юды свае...
І калі,
сонцам новых надзей
прыглядаемся выраю,
лічым сілы свае жывыя і тых, што ляглі, —
для нас дорага слова гарачае, шчырае,
як зярнё для шчарнелых далоняў зямлі.
Любіш край за бярозы, за месяц, за восені дзіўныя,
а тымбольш яго нам як скажы ня любіць?
калі нівы і рэкі, палотны азёр пераліўныя,
калі песьні, што б'юць жывой сілай крыніц, —
нам гавораць аб долі сярмяжнай аратага
і адкуль на нас хмары плывуць і плылі,
дзе ляжаць нашы сілы, надзеі віхурамі зжатыя,
колькі поту і сьлёз мае кожная грудка зямлі...
Дзіўна песьні Твае расьцьвітаюць
далёка сузор'ямі,
над другімі палямі яны сіратліва мігцяць,
і тамv яны пэўна над роднымі сяньня разорамі
асыпаюцца
золатам восені,
асыпаюцца шумам трысьця...

М. ТАНК

Вільня, 25.I.37.

На паэтычнай вышыні

(Аб творчасьці Натальлі Арсеньневай)

Асноўныя рысы творчасьці Натальлі Арсеньневай выдзяляюць яе спасярод іншых сучасных беларускіх паэтаў, як пясьнярку сусім індывідуальную, з сваеасаблівым паэтыцкім сьветаадчуваньнем, із спэцыфічнымі асаблівасьцямі артызму. Дзякуючы характару свайго таленту, а часткова мо' і абставінам аб'ектыўным, якія яе змусілі жыць далёка ад Бацькаўшчыны, не змагла яна ўліцца ў агульнае русло сучаснай беларускай паэзіі, апяваючай адраджэньне народу, ягонае змаганьне за свае правы, але пайшла ўласнай дарогай літаратурнае творчасьці, даючы ў ей перавагу праблемам чыста эстэтычным. Гэтую сваю апрычонасьць і розьніцу ад агульнага характару сучаснай беларускай паэзіі моцна падчыркнула і сама аўтарка ў вадным з найнавейшых вершаў п. н. *Маладым паэтам*. Грамадзкім матывам, пераважаючым у творчасьці нашых паэтаў, іхняй бунтарнасьці і магутным прызывам да барацьбы проціўстаўляе яна свой уласны паэтыцкі сьвет, сьвет чыстае красы:

Мае дні над аржоньнем цьвітуць туманом
і плывуць серабраным у даль павучыньнем,
і зьвіняць алавяным, асеньнім дажджом,
і ў лясох верасамі мядзянымі стынуць.

Я, як жоўтая восень, стаю над жыцьцём
і гляджу на яго, хоць наўкола змаганьне.
Мае вершы — над сонным балотам трысьцё,
мгла сівая асеньняга раньня.

Ня шырокім размахам пачуцьцяў і парываў, не магутнай дынамікай бунту й барацьбы адзначаецца творчасьць Арсеньневай, але яна носіць на сабе адпячатак мяккага і нязвычайна чулага лірызму, падхварбаванага ноткай сумнай настраёвасьці, часамі радасных захапленьняў. Характэрна, што лірызм гэты вельмі рэдка зьяўляецца абстракцыйным, але ён грунтуецца перадусім на фоне апісаньняў прыроды ў розным яе стане і праявах. Беларуская прырода, як крыніца паэтыцкага натхненьня, выступае так шырака і амаль што поўнаўладна ў творчасьці нашай пясьняркі, што нават яе даволі многія рэфлексыйныя вершы, у якіх асабліва часта разважае аб людзкім шчасьці, аб мэце жыцьця і інш., зьяўляюцца нічым іншым, як толькі рэфлексам захапленьняў хараством прыроды. Урэшце і патрыётычныя матывы ў Арсеньневай конкрэтызуюцца на матар'яле прыродаапісальным, як глыбокае каханьне роднага краю. Гэтыя апошнія даволі выразна выступаюць у аддзеле вершаў *Родны край*, зьмешчаным у зборніку „Пад сінім небам."

Звычайна абраз прыроды, вельмі містэрна адмаляваны, выклікае ў душы пясьняркі глыбокія перажываньні, родзіць цэ-

лую гаму разнастайных пачуцьцяў. Гэтак напрыклад жоўта залатая восень, якой паэтка найбольш прысьвячае ўвагі з усіх пораў году, родзіць у ей пачуцьцё ціхага суму і тугі за няведамым шчасьцем; абраз сярэбранае ночы і яе заварожанага супакою напаўняе душу вялікай асалодай; а вясна сваей жыватворчай сілай выклікае звычайна мноства высокіх парываў да паўніні жыцьця, як гэта можна абсэрваваць у адрыўку верша *Ішла вясна:*

І дрыжэлі знаёмыя струны ў душы,
пазабытыя ў часе зімовай цішы,
і хацелася нейдзе ірвацца, ляцець,
і хацелася крыльлі птушыныя мець, —
і хацелася сонца абняць, палаваць,
і пяяць, і пяяць, і пяяць, і пяяць, —
бо йшчэ раз за маіх пералётных гадоў
йшла вясна ў зеляніне палёў!

Даволі часта абраз прыроды із перажываньнямі і пачуцьцямі аўтаркі творыць у вершы г. зв. тэматычны паралелізм, вельмі характэрны для народнае песьні.

Трэба моцна падчыркнуць, што паэтыцкі падход Арсеньневай да прыроды, гэтай багатай крыніцы натхненьня ўва ўсей паэзіі наагул, ёсьць своеасаблівы, значна іншы, чымся ў многіх нашых паэтаў. Мала таго, што абразы прыроды зьяўляюцца ў яе прасякнутыя чулым лірызмам, бо й наагул рэдка які паэт патрапіць глыбей не зарэагаваць на яе чар і хараство. Характэрна тое, што на прыроду рэагуе яна амаль выключна з эстэтычнага гледзішча, бачучы ў яе праявах найвышэйшае хараство:

Для мяне ня мутною вадой каляін
надыходзіць вясна і ня сьнегам счарнелым, —
мне сьмяецца яна жоўтым пухам вярбін,
яснай песьняй жаўронка ў палёх зарунелых.—

кажа яна ў вадным з найнавейшых сваіх вершаў, і далей:

Мне ня жаліцца восень у дробных дажджох,
у гнілых туманох на размоклым загоне, —
мне яна павучыньне прадзе ў лазьнякох,
жоўтым сном на ціхое кладзецца аржоньне.

Гэтак сама лета і зіма прадстаўляюцца ў яе багатым паэтыцкім выбражэньні поўнымі ўзапраўднай красы. Апроч гэтага прыроду паэтка ў вялікай меры ўвасабляе, прадстаўляючы яе як жывы твор, здольны разумець і адчуваць.

У абразох і зьявах прыроды паэтка вычувае багатае затоенае жыцьцё, зусім іншы сьвет, прыгожы і шчасьлівы, які назвала некалі „Пад сінім небам“ і ахрысьціла гэтым назовам першы зборнік сваіх вершаў. Яна стараецца ўцячы ад шэрага штодзеннага жыцьця ў створаны ў сваім выбражэньні сьвет прыроды і зрадніцца з ім. Загледжаная ў чароўны заход сонца і маляўнічую ігру калёраў, яна кажа:

Я хачу на мінуту забыцца аб горы
і глядзець, як у рожавым захаду моры

Косы бледнага сонца спляліся.
Я памерці хачу вось такою парою,
хваляй сонца залітая ўся залатою,
Каб і слоў тых ня чуць: „прабудзісь!“

І вось гэтае ізаляваньне ад запраўднага жыцьця і ствараньне ў сваіх мроях іншага сьвету, лепшага і прыгажэйшага, ёсьць вельмі характэрнай асаблівасьцяй паэтыцкага сьветаразуменьня Арсеньневай. Але адначасна гэтая перавага паэтыцкай абстракцыі над рэальным жыцьцём, а так-жа ўспомненае ўжо звужэньне тэматыкі яе твораў і адсутнасьць у іх матываў змаганьня і барацьбы на карысьць чыста мастацкіх праблемаў могуць шмат каму выдавацца, як люксус, які гучыць дысанансам у нашыя жорсткія часы. Паколькі гэты закід можна паставіць творам нашай пясьняркі, калі падыходзіць да іх з гледзішча ўтылітарнага, патолькі з гледзішча чыста літаратурнага зьяўляюцца яны беззаганнымі. Ды ўрэшце маюць яны, — хоць пасрэдна — і вялікую грамадзкую вартасьць, бо як трапна зазначыў наш паэт-эстэтык Максім Багдановіч, што ўжо сама эстэтычная эмоцыя ад красы, выяўленай у творы, узварушае нас, родзіць бадзёрасьць і веру ў будучыню і пабуджае да творчае працы. А творы Арсеньневай, якія адзначаюцца высокім артызмам і ўзапраўднай красой, поўнасьцю адказваюць успомненым вымаганьням.

Дык дзе-ж урэшце хаваецца сакрэт артызму творчасьці Арсеньневай, якая захоплівае нас красой, чаруе містэрнымі абразамі, песьціць нашае вуха дзіўнаю музыкай гукаў?

Як ведама, нашая штодзенная мова, якая спаўняе чыста камунікатыўныя функцыі, бо служыць узаемнаму паразуменьню людзей, зьяўляецца нязвычайна бедная, каб можна было ў ей канкрэтна выразіць усе найглыбейшыя пачуцьці і пластычна адмаляваць усе абразы, выкліканыя ў буйным выбражэньні мастака. Кожны паэт перамагае гэтыя труднасьці такім спосабам, што адпаведна арганізуе свой слоўнікавы матарыял, творачы розныя мастацкія прыёмы і надаючы ім адпаведнае эмоцыянальнае адценьне. Такім спосабам у кожнага культурнага народу, апрача розных дыялектаў і жаргонаў, якія складаюцца на мову шырокіх масаў, і апрача мовы кніжнай, літаратурнай, якой паслугоўваецца інтэлігенцыя, існуе так-жа і г. зв. мова паэтыцкая, ужываная выключна ў паэзіі. Характэрнай асаблівасьцяй апошняй зьяўляецца тое, што яна, пры помачы адпаведнай арганізацыі слоўнікавага матарыялу, мае ў літаратурным творы тыя ці іншыя артыстычныя функцыі, стараецца выклікаць эстэтычныя перажываньні. Вартасьць мастацкіх прыёмаў, твораных на аснове языковага матарыялу, у вялікай меры залежыць ад іх навасьці, арыгінальнасьці і нязвычайнасьці. Дзеля гэтага кожны паэт, карыстаючыся з дасюлешняй паэтыцкай мовы, стараецца ўсьцяж яе разьвіваць і дасканаліць, дадаючы ей тыя ці іншыя індывідуальныя асаблівасьці, узалежненыя ад розных артыстычных мэтаў.

Вось-жа ў гэтай галіне зьяўляецца Арсеньнева ўзапраўднай артысткай і тут іменна крыецца глыбіня ейнага таленту. З пасярод многіх мастацкіх прыёмаў зьвяртае яна асаблівую ўвагу на паэтыцкае апрацаваньне і ўпарадкаваньне языковага матарыялу, надаючы яму заўсёды выразныя артыстычныя функцыі. Рэзультат з гэтага такі, што, калі ўважна ўслухацца ў яе вершы, то ня знойдзем мы ў іх амаль ніводнае строфкі, якая-б так ці йначай не прамаўляла да нашага пачуцьця і не выклікала адпаведнага настрою. У галіне мастацкага дасканаленьня мовы асаблівы націск кладзе паэтка на падбор такіх гукаў, якія сваей музыкай суладна гарманізуюць із зьместам верша. Гэтак напрыклад яна любуецца ў плаўных і найбольш прыемных для вуха гуках, як *ль, н* і падобныя; часта ўжывае злучэньне іх у групы тыпу аржо*ньне*, зьмярка*ньне*, змага*ньне*, асе*ньні* і г. д., якія адказваюць нязвычайна мяккаму і далікатнаму характару ейнага лірызму, сьпеўнасьці і мілагучнасьці яе рытмікі. Калі выразіцца мэтафорычна, то, дзякуючы ўспомненым асаблівасьцям, верш Арсеньневай ня чытаецца, але паважна плыве і пераліваецца багацьцем нязвычайна далікатных і суладных тонаў і гукаў.

Трэба прызнаць, што аўтарка працуе над мастацкім вырабленьнем сваей мовы і ўсьцяж бывае незадаволенай з асягнутых рэзультатаў. Гэтак, калі ей, загледжанай у чароўны абраз захаду сонца, „хочыцца выліцца песьняй,“ яна сьцьвярджае, што мучыць яе пачуцьцё нямочы:

Бо ўсе словы здаюцца малымі,
ўсе ня тыя, што выцьвісьці хочуць.

Але яна верыць, што з часам апануе ўсе паэтыцкія магчымасьці мовы і зможа тады найпрыгажэй выразіць усё тое, што толькі выабразіць у сваей багатай паэтыцкай фантазіі. Гэтак заяўляе паэтка ў адным з найпрыгажэйшых сваіх вершаў п. н. *Лебядзіная песьня.*

Але прыйдзе мой дзень і знайду я патрэбныя словы,
словы тыя, якія цяпер не пачую ніколі й нідзе.
Буду ўмеці чмялямі гусьці ў раззалочаным цьвеце ліповым
і шаўковай шасьцець асакой на зялёнай блікучай вадзе.

— — — — — — — — — — — —

Раскажу аб мяцеліцах ночных, няспаных да раньня гадзінаў,
аб спакою васеньніх зьмярканьняў і яснасьці сплаканых зор.
А ўсе словы злучу я у песьню прыпевам нязвыклым, адзіным,
а ўсе песьні ў адзін — бесканечна-магутны акорд.

Побач з вялікай мілагучнасьцю творчасьці Арсеньневай, у вялікай меры зарысоўваецца так-жа і яе вобразнасьць. Найбагатшыя мастацкія прыёмы, ужываныя дзеля вобразнасьці і пластычнасьці, мэтафары, іграюць у творах Арсеньневай адну з найпаважнейшых роляў. Цікава зацеміць, што паколькі ў ранейшых вершах опэруе паэтка мэтафорыкай пераважна традыцыйнай, патолькі ў вершах навейшых творыць яна больш сьмелыя й арыгінальныя мэтафары, што бязумоўна трэба ўважаць, як поступ.

Вельмі цікава, што мэтафорыка Арсеньневай, як у некаторай меры і Танка, зьяўляецца пераважна аснаванай на матарыяле з жыцьця беларускай вёскі, што таксама надае яе творам спэцыфічны адпячатак. Вось некулькі прыкладаў: „Старыя вербы над рэчкай пранікамі пяраць па шэрай воднай палатніне,“ альбо: „Мокрым пласконьнем туманы ляжаць,“ „А над шляхам іх цёмным, нізінным белы месяц блікучым нарогам ноч парэжа на скібы — гадзіны,“ альбо ўрэшце: „Чырвоны блеск асеньні захад праз рэдкі кужаль хмараў цэдзіць“... Цемра „клубком разблытаецца шэрым, павісьне зрэб'ем нечасаным над лесам сьцішаным, над намі.“

Такога роду мэтафорыка павялічвае беларускую народную стыхію ў творах Арсеньневай, з другога-ж боку — дзякуючы сваей навасьці й нязвычайнасьці — выразна канкрэтызуе абраз, робіць яго пукатым і пластычным. Нярэдка вобразнасьць паэткі вызначаецца так-жа й малярскімі эфэктамі. Гэтак яе ўлюбленая восень зьяўляецца заўсёды жоўта-залатая, неба вечна ў яе сіняе, захад сонца ярка чырвоны, ноч сярэбраная і г. п. Гэтак вельмі пластычна, але і ня менш маляўніча выглядае абраз усходу сонца ў наступных радках паэмкі *Шчасьце:*

Сонца усходзіць... Зьбялеўшыя зоры
тонуць у рожавым полымі—моры,
ў чырвань малююцца соснаў вяршыны,
рожавай робіцца мгла над лагчынай.
Ў лесе паўцёмна. Ільлёвыя змрокі
ў гушчы хаваюцца соснаў высокіх.

Каб закончыць гэты кароткі агляд лірычнай творчасьці Арсеньневай, трэба ўспомніць яшчэ і аб тэхніцы яе вершаў, якія з гэтага гледзішча заслугоўваюць на вялікае прызнаньне. Паэтка, здабыўшы багатую літаратурную культуру, усебакова і старанна працуе над сваімі творамі. Дзеля гэтага ў яе вершах мы ня знойдзем ані шурпатасьцяў, ані наіўнасьці, якіх, нажаль, ня могуць высьцерагчыся многія іншыя нашы паэты,

Некалькі слоў спэцыяльнае ўвагі трэба прысьвяціць кароткім эпіцкім паэмкам Арсеньневай у цыклю *Зачараваны кут.* Паколькі ў яе лірычных вершах пераважаючай тэматыкай была прырода, патолькі тут ёсьць ёй — народная творчасьць. Вельмі характэрна, што паэтка ў успомненым цыклю адкрывае толькі пануры і мёртвы сьвет народнай фантастыкі, любуецца яго таёмнасьцю і жудой. Такі падыход да народнае крыніцы часткова гарманізуе з яе ўцяканьнем ад рэальнага жыцьця ў абстракцыйны сьвет хараства, так характэрнае ў лірычных вершах.

Фабула гэтых паэмаў звычайна няшмат мае супольнага з народнымі матывамі, а ў большасьці зьяўляецца ўласнасьцю пясьняркі. Пераважна справа выглядае так, што аўтарка апіраецца на адным альбо некалькі матывах з народных казак і легендаў, а ў далейшым разьвівае іх самастойна і дапаўняе уласнымі канцэпцыямі, але робіць гэта так, што кожны, хто ня знае добра

народнае творчасьці, будзе ўважаць іх за фольклёрыстычныя „par excelence." Гэтую артыстычную містыфікацыю асягвае паэтка галоўным чынам нязвычайна мастацкім насьлядаваньнем стылю народнае творчасьці. І ў гэтай галіне зьяўляецца яна незраўнанай артысткай, што патрапіць з даволі агранічанага матарыялу снаваць розныя ўзоры, захварбоўваць іх глыбокай эмоцыянальнасьцю, выклікаць настраёвыя й музыкальныя эфэкты. Залежна ад розных артыстычных мэтаў, часамі стыль народнае творчасьці шырака ўдасканалівае, падносіць яго на высокую артыстычную вышыню пры адначасным захаваньні тыповых народных асаблівасьцяў, часамі-ж зьніжаецца да артыстычнага прымітывізму народнае песьні, як гэта можна бачыць у наступным фрагмэнце галашэньня ўтопленіцы ў творы *Балотніца:*

Ой, цяжкая мая доля горкая,
загубілі мяне вочы ясныя,
вочы ясныя, косы доўгія,
сэрца вольнае ды гарачае.
Загубіла я сваю маладасьць.
Веру страціла. сілы страціла,
а адна была з сваім сэрцэйкам,
з маладой душой, што хацела жыць.
Не сьпякло мяне ясна сонейка,
не зламаў віхор у васеньню ноч,—
загубіў мяне чарнабрывы мой,
жартаваў, гуляў з маладой душой,
жартаваў, гуляў, а песьля пайшоў,
а я плакала, залівалася!

У іншым творы гэтага цыклю — *Лебядзінае возера,* паэтка вельмі ўдала насьледуе стыль і сьпеўную рытміку былінаў.

Апрача гэтага творы з цыклю „Зачараваны кут" адзначаюцца цікавай, глыбока абдуманай і артыстычна ўдалай кампозыцыяй. Асаблівa гэта адносіцца да паэмак *Балотніца, Зорка, Шчасьце, Вясельле,* перадусім-жа да *Лебядзінага возера,* як твору з багацейшай і даволі скомплікаванай фабулай. Знаходзім у ім аж тры аснаўныя вузлы фабулы: 1. Любоў Алёнкі з князем. 2. Нешчасьлівая любоў Данілы да Алёнкі і вынікаючыя з гэтага непаразуменьні з князем. 3. Жыцьцё белых лебядзеў і адносіны да іх людзей, што становіць у творы элемэнт фантастычны. Усё гэта пясьнярка містэрна скампанавала і павязала, што ўспомненыя, як-бы асобныя сюжэты узаемна зазубляюцца і даюць артыстычную цэласьць. Зьяўляецца гэта яркім доказам, што Арсеньнева, паводле свайго характару лірычная пясьнярка, мае таксама вялікія здольнасьці эпічныя і можа яшчэ ў гэтым кірунку шырака выявіць і разьвіць свой талент.

На падставе гэтага кароткага і, зразумела-ж, вельмі агульнага агляду творчасьці Натальлі Арсеньневай, прадстаўляецца нам яна, як пясьнярка з першарадным паэтыцкім талентам, як вялікая артыстка слова. І хаця ізалявалася яна амаль поўнасьцю ад грамадзкіх матываў, так актуальных у сяньняшнім нашым

жыцьці, і агранічылася да даволі вузкага прасьцягу сюжэтаў, то аднак яе значэньне для беларускае літаратуры аграмаднае. Дзякуючы нязвычайна далікатнаму таленту і асаблівай чуласьці на хараство, беларускую мову паднесла яна на высокую роўню, шырака ўдасканаліла і спрэцызавала стыль паэтыцкае творчасьці, як чыста-лірычнай, так і лірычна-эпічнай, а так-жа асягнула вялікія рэзультаты ў галіне мастацкага выкарыстаньня фольклёру.

У сучасны мамэнт, як было ўжо сказана, Арсеньнева робіць вялікія поступы ў кірунку адсьвяжэньня свайго таленту шляхам зьбліжэньня да новых, больш сучасных формаў паэтыцкае творчасьці, а так-жа праектуе большыя літаратурныя кампозыцыі, з эпіцкім падкладам, аснаваныя на фольклёры. Гэтыя спробы й праекты астаецца толькі прывітаць і пажадаць шырокай іх рэалізацыі, бо ўсё тое, што творыць яе вялікі талент, займае ў нашай сучаснай літаратуры адно з найбольш пачэсных месцаў.

К. Бруевіч

Францішак Скарына на грунце унівэрсытэцкага жыцьця у Падуі

Старыя унівэрсытэты ў Заходняй Эўропе жылі так самастойна, што былі быццам дзяржавай у дзяржаве. Дзеля гэтага і рабілі аграмадны ўплыў на масы студэнцкай моладзі, узгадоўваючы так ейны нутраны сьвет, як і вонкавае жыцьцё. І гэта ёсьць прычынай, дзеля чаго справа зразуменьня асобы Францішка Скарыны вымагае ад нас ня толькі магчыма дакладнага знаёмства ягонай біографіі і хронолёгіі, але так-жа плястычнага сабе прадстаўленьня вялікага Палачаніна на грунце студэнцкай рэчаіснасьці ў Падуі.

За праваднiка ў гэтым артыкуле бяром сабе ведамага знаўцу гуманізму, прафэсара кракаўскага унівэрсытэту, д-ра Станіслава Віндакевіча (сяньня жывец), каторы многа архівальных студыяў і не адну падарож пасьвяціў іменна гісторыі ўнівэрсытэту ў Падуі з ягоным уплывам на паўночна-усходнія землі.

Паводле праф. Віндакевіча, развой і расьцьвет Падуі быў гэнэтычна неабаснаваны, аднак такі шыбкі і прыгожы, што заслугоўвае, каб яго назваць фэномэнам. „Падобна як на небе бываюць хвіліны хмарныя і пагодныя, так і ў гісторыі чалавецтва ёсьць пэрыяды, як ноч цёмныя, і як дзень ясныя. Сярод вотхлані падымаецца раптам заслона. Асьветленыя праменьнямі ста сонцаў, на раскошнай ніве гісторыі паказуюцца шэрагі геніяў: борацца, штурмуюць, даказываюць цудаў. Заслона ападае. Зноў панура і страшна. Хто грае прад намі гэтую камэдыю жыцьця, Бог ці натура, вось пытаньне" (Др. Ст. Віндакевіч. Падуа 1891 бач. 5—6). Такога выбуху гейзара, як Падуа, ня дасца прычынна вывесьці ні з эвалюцыі хрысьціянскага духу, ні з выгасаючых

аганькоў гінучага аканчальна паганства, ні з рэакцыі на цераз-мерны схолястыцызм, ані ўрэшце з тагачасных клічаў поступу. Усё гэта можа вытлумачыць толькі тую ці іншую драбніцу ўспомненага фэномэну, які як нявыясьненае зьявішча пяройдзе сам у гісторыю цывілізацыі чалавецтва.

Адроджаная цывілізацыя, раней як Скарына прыбыў у Падую студыяваць, агарнула ўжо полымем усю Заходнюю Эўропу. Характарызавалі яе дзьве рэчы: была ў роўнай ступені кніжнай, як артыстычнай, з літаратуры клясычнай бяручы „творчую матэрыю мысьлі і імкненьняў веку" (6). Гэты сваеасаблівы шал дайшоў да свайго найвышэйшага пункту ў XVI ст. у Падуі. Бо ціж ня быў гэта сапраўды сьвяты і багаслаўлены шал, які агарнуў тутака імення душу Скарыны, бяручы яго ўжо на цэлае жыцьцё ў палон якжаж новай і труднай тады ідэі пісьменства і друкарства ў роднай мове? Менш ідзе нават аб тое, кім быў Скарына: добра уроджаны але зьбяднелы шляхціц з даўнейшага беларускага роду, ці славутны мешчанін гораду Полацка, або ўрэшце працавіты селянін з падполацкіх ваколіц. У кожным выпадку мусела захапіць яго да вялікага чыну адносна вялікая прычына, вялікая гістарычная плынь, *furor sacer*, з якім чалавек XVI ст. пасьвяціўся раз выбранай ідэі. Гэты высокі палёт Падуі быў аднак, як сяньня дасьледжана, магчымы да зрэалізаваньня дзеля таго толькі, што бліскае нам праз Скарыну гэтае унівэрсытэцкае места *Padova* было тады багатае грашмі. „Грошы ёсьць талізманам поступу. Падуа распараджалася фантастычна-аграмадным бюджэтам у 65—75 тысячаў флёрэнаў" (6—7), што пазваляла ей згуртаваць паўтары сотні знамянітых прафэсараў ува ўсіх галінах веды, стварыць абшырныя выкладовыя залі, залажыць багатыя бібліятэкі і габінэты, першы батанічны агарод, прыкладны анатамічны інстытут... Нічога тады дзіўнага ў тым, што Італія стварыла ў гэным пэрыядзе новую цывілізацыю і дыктавала моду цэламу сьвету. І на землях беларускіх ведамыя тады былі напр.: вэнэцкія лютні, вэнэцкія люстэркі, вэнэцкія апраўы, вокны, палашы, лямпіёны, вэнэцкія аксаміты і т.д. і т.д. Ня што іншае, як Вэнэцыя, выконываючы сваю гістарычную праграму „зрабіла з Падуі наперад цэнтральны унівэрсытэт вэнэцкі (1458), пасьля італіянскі, і ўрэшце эўрапэйскі" (8). Усе падуанскія студэнты атрымліваюць ад ураду многа каштоўных прывілеяў, палёгак і звальненьняў ад мыт і аплатаў, моладзіж беднай і здольнай адчынены насьцяж 11 бурсаў! Быць можа, што ў адной з іх пражываў Скарына ці іншыя яго землякі. З такім размахам Падуі магла канкураваць адна Балёнія, гуртуючая моладзь дзеля студыяў кананічнага права.

У якім віры жыцьця і ў якой атмосфэры апынуўся ў Падуі Скарына, сьведчыць тое, што тады, паколькі можна палічыць, іматрыкулявалася тутака нешта 36 тысяч студэнтаў (16 тысяч чужаземцаў і 20 тысяч італіянцаў), згэтуль 26 тысяч праўнікаў і 10 тысяч мэдыкаў. Кагож тут ня было? Разам было 21 нацыяў. „Сярод securing разнакалёрнай масы тутэйшых вучняў бачым Грэка і *Русіна* (падчыркн. наша), Андалюзца і Шкота..." (9). Кожны з іх сьпяшаўся *proficiscens in Italiam studii gratia*, не зважаючы на далёкую і нераз рызыкоўную падарож.

З увагі на тое, што шмат Русінаў і Літвіноў пападала ў падуанскі унівэрсытэцкі *album* з этыкетай польскай, ня ёсьць нам абыякава, колькі палякоў іматрыкулявалася ў Падуі у XVI ст. Вось-жа было іх нешта 1800, прыгэтым у дзесяць разоў болей студыявала права, як мэдыцыну.

Ёсьць студэнцкія апісаньні, што адмалёўваюць выгляд Падуі, калі да яе пад'яжджалася. Вось што ў трэцяй асобе піша адзін у сваім *itinerarium*. „Урэшце стануў перад Падуай. Пабачыў яе ў раньнім сонцы, цудоўна распаложаную, як гурыска, на мяккай пасьцелі вінаграду; тапалі і цыпарысы аздабляюць ейнае ложа, а лёгкі вецярок прыносе запах красак і насалоды.

Гэта-ж сапраўды жыцьцё, якога жадаю, а як маю грошы, чамуж мне з яго не скарыстаць?" (12). Гэтак ці падобна мог думаць сын паўночнага Полацку, калі ў сваей пазаальпэйскай падарожы першы раз вітаў зрокам і сэрцам *Padova dotta*.

А як выглядаў падуанскі студэнт? Як дапушчальна апранаўся Францішак Скарына? Падуанскі студэнт, гэта тып тагачаснага элеганта. У панчошках да кален і шоўкавай сарочцы ахінуўшыся лёгка аксамітным плашчам, абшытым футрам, ідзе сабе па вуліцах Падуі гібка і з вяліка-мяшчанскай самапэўнасьцю, маючы пад рукою бліскучую шпаду. На галаве абведзены калёрным шнурам мяккі і высокі капялюх, ад якога адстае прэтэнсыяльна некалькі пёраў; на шыі бела-сьнежная крыза, што ў карунках набірае далікатных і мяккіх контураў, а адусюль залятае запах пэрфум і піжмы, з хустачкі, рукавічак, вусікаў і валасоў... Дык жыцьцё тут кіпела магутна, даючы міліённыя праявы як заўсёды сумныя і вясёлыя. Гэтае жыцьцё мела нікаторыя характэрыстычныя рысы, якіх прамаўчаць нельга, а імення, што было вельмі інтэлігентнае і вельмі разнастайнае" (12—13). Ведама, найлепей матарыяльна меліся ў Падуі сыны вялікіх паноў з беларускіх земляў, напр. Радзівіллы, Сапегі і іншыя магнаты з усходніх рубяжоў і паўночных старон, што ехалі сюды ці то на студыі (*addiscendae linguae Italicae gratia*), ці то ў купальні (*cauza recuperandae valetudinis*), што былі бліска Падуі. Столькі тут іх прыяжджала, што аж паўстала *contubernium* ці *hospitium Polonorum* (14), у каторым ні адзін напэўна Беларус і Літвін пабываў. Падуа магла хваліцца, што тут вучылася „нешта з шэсьць папежаў, некалькі каралёў і князёў, шмат вучоных і павадыроў" (15), а сярод іх Баторы і Капэрнік, таксама пазьнейшы жмудзкі біскуп Юры Альбініус (1538), менш ведамы як лацінскі паэт.

„Годным увагі зьяўляецца наплыў у Падую студэнтаў і дзеля таго, што тэрыторыяльна сягае вельмі далёка. Ужо Ажэхоўскі кажа, што многа шляхты з Чырвонай Русі ехала ў 1549 г. на унівэрсытэты заальпійскія; а ў мэтрыцы нацыянальнай

прыналежнасьці знаходзім імёны, якія самым толькі гукам прыпамінаюць цёмныя літоўскія лясы або задуманыя пабярэжжы Жмудзі. Кіняшко, Копэць, Сапоцько*) мусіць першы раз тады паказываюцца на картах унівэрсытэцкіх мэтрыкулаў, і з над Адрыятыку перавозяць у Бацькаўшчыну зерне вялікай цывілізацыі, каторую бязсумлеву не маглі агарнуць, але каторая іх імёнам дадае блеску не малой навасьці. Адначасна спасярод малапольскай і *рускай* (падч. наша) шляхты выдзяляюцца індывідуальнасьці, каторыя сяньня яшчэ зьдзіўляюць. Такія прозьвішчы, як Возачэнскі, Окрэнгліцкі, Мышчынскі, Міцкіцкі, Чолханскі гучаць нясвойска ў вушах гісторыка цывілізацыі. З якіх куткоў яны выйшлі, якім спосабам вырваліся з самотных сядзіб сваіх, да каторых дагэтуль ніхто не дайшоў, апрача толькі каралеўскага камісара ці голасу пабудкі на Татара, вось новае пытаньне пад развагу“ (25). Часьць падуанчыкаў, калі гэта былі праўнікі, працавала посьле ў загранічнай дыплёмацыі, часьць варачалася ў край і абымала становішчы гарадзкіх пісараў і судзьдзяў. У ліку гэтых паводле жаролаў знаходзіцца нейкі А. Станкевіч (1595). Падуанчыкамі былі: Літоўскі падскарбі Крыштоф Нарушэвіч (1588), які адзначаўся вялікай сумленнасьцяй, далей віленскі войскі Ян Абрагамовіч (1598), ведамы аўтар брашуры „Думка Літвіна аб таннай куплі збожжа а дарагой продажы“(1595), урэшце маршалак шляхты вілкамерскага павету — Раецкі, пазьнейшы камісар дзеля пагранічных курляндзкіх спраў, уканцы маршалак літоўскага трыбуналу. Такіх людзей выдала Падуа, якая нам дала Скарыну.

Дзеля таго аднак, што вялікі Палачанін вучыўся ў Падуі мэдыцынскіх навук, зьвернем асобную ўвагу на іх ровень у тамашнім унівэрсытэце. Падуа ў XVI стагодзьдзі мела асабліва добра пастаўленыя студыі мэдыцынскія (і праўныя), пры гэтым у гэтай галіне быў новы кірунак, паводле якога „мэдыцына паступаецца наперад ня колькасьцю камэнтараў, але лікам умела дасьледжаных зьявішчаў“ (32). І тадыж паявіліся аматары. Гэткую на паказ лекцыю анатоміі знаходзім увечненую ў аднаго з тагачасных маляроў.

Падуанская мэдыцына мела ў XVI ст. чарод выбітных прафэсараў. Праф. Віндакевіч прывёў чарод прозьвішчаў, якіх тут не пералічаем, бо адносяцца пераважна ўжо да другой палавіны XVI ст., калі Скарына быў ужо ў іншым месцы. Сярод падуанскіх практыкаў пераважалі галеністыя, г. зн. тыя, што трымаліся „старасьвецкага тэксту з некарысьцяй для навукі і досьледаў“ (37). Інтэрэсаваліся ў Падуі нават нашым палескім каўтуном, пэўнеж не бяз нашага учасьця, прычым прафэсар Гэркулес Саксонія побач з іншымі трымя аўтарамі выдаў так-жа расправу: *De plica quam Poloni gwozdziec, Roxolani colthunum vocant liber. Potaviae* 1601. Гэтая праца была свайго роду адказам на пытаньне што да прычын і азначэньня беларускай хваробы каўтуна, пытаньне, пастаўленае мэдычнай калегіяй у Падуі, міла спатканае прызнаньнем і ветлівай просьбай, з якой у гэтай справе да яе зьвярнуліся з далёкай Сармацыі. Сьведчыць гэта аб непараўнальна—высокай навуковай плоднасьці італіянскай літаратуры, каторую тады ўсё інтэрэсавала. Падуанская студыя здабыла такім спосабам значную як на той час папулярнасьць, а сьвядоцтвам гэтага будзе тое, што незадоўга па 1501 г. *„прыехаў у гэтае места адзін Беларус з Полацка* (падч. наша). Ёсьць гэта сьляды вельмі глыбака сягаючага ўплыву, каторы аценіць прынамсі агульна будзе неадрэчы“ (39).

*) Пазьней былі тут Пётра Косьцюшко і Давід Міцкевіч ex Magno Ducato Lituanicae.

„Нашым мэдыкам таго часу — піша праф. Віндакевіч — нельга не адмовіць добрай волі, калі зьвернем увагу на тое, што былі гэта ўбольшасьці сыны мяшчан ці мужыкоў, каторым выезд у Падую быў ужо ахвярай, а цэлае жыцьцё прадстаўлялася як заўсёдная барацьба за быт і адначасна барацьба з забабонам.

Прыгледзьмася-ж гэнаму абскурантызму, каторы ляжыць глыбака на дне нашай астралёгіі; прыгледзьмася-ж пашыранью парацэльзызму*) ў Польшчы, сьвядоцтвам якога ёсьць як Твардоўскі, так і той забабон у каралеўскім розуме Жыгімонта Аўгуста. (Ведама, што розум гэтага апошняга Ягайлавіча хоць не ў адной справе рашаў як трэба, не перашкаджаў яму зусім займацца ў каралеўскім замку выкліканьнем ценяў памёршай Барбары). І раптам гэта ўсё зьнікае. Хто гэтую перамену даканаў? Пэўнеж, польскія мэдыкі і прыроднікі. А што не даканалі ўсяго, што не ператварылі народ запаленцаў і містыкаў (?) у народ цьвярозых мысьліцеляў, гэта што іншае. Але падумайма, што тады Падуа дала нам толькі 50 лекараў, што Балёнія дала нам другіх столькі-ж, значыцца прадукцыя края (?) ад Карпат да *Балтыку, Дзьвіны* (падч. наша) і Чорнага мора налічала у XVI в. аднаго лекара ўгод — а ў гэтай цыфры пабачым страшную праўду“ (45 - 46).

Наогул падуанскія мэдыкі адзначаліся грамадзкім заінтэрэсаваньнем і займаліся апроч мэдыцыны часта іншымі галінамі веды, што былі ў бацькаўшчыне занядбаныя. Так ляўрэат Францішак Скарына (1512 натуральна ў Падуі *via* Вільня-Кракаў) не займаўся ўжо цалком мэдыцынай, а ўвесь пасьвяціўся справе перакладу біблії на беларускую мову. Што ў гэтым кіравала імі прадусім любоў свайго народу, роднага краю і народнай гісторыі — гэта здаецца зусім ясным..., (дык) мала зьвярнуць увагу на навуковыя ўплывы Падуі, але трэба так-жа дакрануцца глыбейшых праблемаў народнага жыцьця і гісторыі“ (46—47). Дык і Скарына, як і падуанчык Ян Замойскі, мог сказаць: *Patavium virum me fecit.*

*) Парацэльзус стварыў дактрыну, што зьяўляецца камбінацыяй тэозофіі і мэдыцыны.

Каб лепей зразумець, як *doctor medicinae* Скарына стаўся ідэёвым перакладчыкам на беларускую мову біблії і праз гэта стаўся бацькам беларускага пісьменства, трэба ведаць, што кожны студэнт у Падуі, праўнік, мэдык, ці тэолёг, пачынаў адукацыю слухаючы выкладаў даваных з катэдры *humanitatis*, як называлася тады філёлёгія клясычная. У XVI в. уважалі яе за „божства стагодзьдзя“ (48), якое найлепей разьвівае і маральна паляпшае чалавека, родзіць у яго артыстычныя асьпірацыі і прыемна завяршае ўсякую спэцыяльную адукацыю. Чалавецтва ў XVI в. імення стаяла на пераломе, „ідучы ад агульнай культуры да культураў нацыянальных, ад духоўнай да сьвецкай — ад касьцельнай да дзяржаўнай...“ (49), філёлёгія-ж сілай фактаў стаецца проціўвагай уніфікуючай культуры сярэднявечча з яе неагранічаным манаполем лаціны. Тымбольш цяжка было Скарыне не адчуць на сабе гэтага ўплыву, калі іменна „на італіянскіх унівэрсытэтах існавалі адна ці дзьве катэдры філёлёгіі, прычэпленыя да мэдычнага ўнівэрсытэту“ (там-жа). Прыгожа сьведчыць аб шырокім уплыве гэтай катэдры філёлёгіі ў Падуі, што выўчыла Яна Ласіцкага (1560), аўтара мітолёгічных і фальклёрыстычных расправаў аб жмудзкіх багох і *аб вясельных звычаях у ўсходніх Славян,* Яна Пятроўскага (1567—1569), *сымпатычнага карэспандэнта з пад Пскова і аўтара дыяруша аб маскоўскай вайне,* Базыля Гіацынта, аўтара *Panegiricus in excidium Polocenze (Pat.* 1580) і інш. Дадаваць ня трэба, што ў такім акадэміцкім асяродзьдзі, як Падуа, хапала так-жа аўтараў модных тады эпіграмаў, гумарыстаў, лютністаў...

Падуанскія студэнты чужаземцы, навучыўшыся італіянскай мовы, гаварылі са сваімі таварышамі паіталіянску. Найагульнейшы падзел студыюючай моладзі быў на *цітрамонтанаў* (Італіянцы, Гішпанцы) *і ўльтрамонтанаў* (рэшта, дык і Беларусы).

Сільную партыю на ўнівэрсытэце налічалі Немцы, каторыя *per fas et nefas* уцягвалі ў сваё таварыства славянскія народнасьці і дзеля гэтага бралі сабе заўсёды кіраўніцтва ў прадстаўніцтве чэскай нацыі, якая паводле статуту была перад Палякамі. Палякі ізноў ненавідзелі сардэчна Немцаў і ад найдаўнейшых часоў вялі з імі заўзятую барацьбу. Дзеля гэтага нічога дзіўнага, што дуэлі і „студэнцкія бойкі характэрызуюць XVI ст.“ (90). Напр. у 1592 г. Немцы зачапілі нейкага Літвіна, калі гэты глядзеў з вакна на вуліцу, і ізноў пачалася бойка. Гэткіх і ім падобных сутычак было тут вельмі многа часам дзеля глупства, што трудна зразумець. Пэўне-ж і *vino padovano* таксама мела ўплыў на маладыя галовы. Толькі паступова культура адраджэньня, і далей уплывы салёну і сэнтымэнталізму злагодзілі гэты дзікі шал да боек, а так-жа абыякавасьць да пралеву братняй крыві.

* * *

З прыемнасьцю падчырківаем тут зычлівыя, а як-жа рэдка спатыканыя ў польскіх вучоных, об'ектыўныя навуковыя адносіны праф. Ст. Віндакевіча да асобы і народнасьці Францішка Скарыны, каторага ўсюды і заўсёды, і нават у 1891 г., калі беларускі народ быў яшчэ ў поўным летаргу, называе бяз ніякіх засьцярог Беларусам і народныя асьпірацыі каторага добра разумее і трапна ацэнівае.

А. САЛАДУХ

Паўстаньне і значэньне гарадзішчаў — гарадоў у Паўдзённа-Усходняў Беларусі
(г. зв. Чорнай Русі)

Адным з найцікавейшых разьдзелаў у антропо-географіі зьяўляецца асадніцтва. Дазваляе яно зразумець, дзеля чаго чалавек будуе сваю асаду ў тым, а ня ў іншым месцы. Пазваляе ўняць ў пэўныя формы тое, што называем інстынктам асядленьня.

Чалавек шукае для сябе найбольш прыдатных варункаў да пасяленьня. Мэтаю пасяленьня ёсьць атрыманьне ўсяго таго, што зьяўляецца неабходным для жыцьця людзкой адзінкі, як гідраграфія, шырокія даліны, ураджайныя глебы, старыя дарогі і гасьцінцы. Гэта атракцыйныя дзейнікі для людзей, шукаючых лепшых умоў да жыцьця.

У залежнасьці ад характару і рознасьці антрополёгічнай розных людзкіх групаў паўстаюць таксама рознага роду асадніцкія тыпы.

Іншыя асады будуць стэпавых Туркмэнаў, а іншыя аседлых земляробскіх Славянаў.

Славянскае асадніцтва ўжо апісалі старадаўныя хронікары, а ў навейшыя часы найлепш дасьледавалі яго нямецкія вучоныя Піпэр, Ратцэль і інш.

У гэтым артыкуле ня будзем затрымлівацца над асадніцтвам агулам, бо шмат трэба было-б на гэта пасьвяціць месца. Мы затрымаемся толькі над гарадамі.

Гарады (папольску „Grody“*) гэта даўней абаронныя месцы распаложаныя ў пунктах з натуры сваей абаронных: на рэчных рукавох, у балотах, над берагамі вазёраў, на вяршынах гораў і ўзгоркаў і т. п. Гэтыя гарадзішчы-гарады звычайна былі акружаны валам і равом.

Людзі ў часе войнаў у гарадзішчах-гарадох абараняліся ад ворага і хавалі там сваю маемасьць. У мірныя часы там адбываліся нарады, сходы, вечы.

*) Гарадзішчы былі ў прадгістарычным часе (польск. grodziska).

Першабытныя людзі, мала абзнаёмленыя із спосабамі штучнай абароннасьці, затое тым лепш умелі знайсьці месца дзеля натуральнай абароны. Гарадзішчы Славяне зналі ўжо ад найдаўнейшых часаў. Гэтак званая Чорная Русь была папросту засеена абароннымі пунктамі, што вынікала з яе тополёгіі і падзеяў гістарычных. Гарадзішчы на Беларусі існавалі ўжо нават перад наездам Нарманаў. Варажская экспансія натыкалася на сільны адпор Славянаў, якія бараніліся ў гарадох-гарадзішчах. Пад аслонай гарадоў разьвівалася асадніцтва. Насельніцтва ў месцах небясьпечных выстаўляла форпосты, а за імі, пад іх абаронай, нясла свае забудаваньні. Археолёгічныя досьледы даказываюць, што ад найдаўнейшых часаў была моцная лучнасьць (гарадзішчаў) гарадоў з асадніцтвам. Побач з руінамі гарадзішчаў знаходзяцца заўсёды сьляды людзкіх магільнікаў.

Вёскі распаложаныя блізка такіх крэпасьцяў у першую чаргу карысталіся абароннасьцяй чым іншыя вёскі далейшыя. А дзякуючы свайму палажэньню, у спэцыяльна выбраных пунктах гэтыя вёскі былі як-бы празначаны дзеля разьвіцьця і разросту ў большыя і мацнейшыя адзінкі г. з. гарады. І на некаторыя з іх перайшоў даўнейшы назоў „горад". Гарады г. зв. Чорнай Русі, параськіданыя сярод лясоў, былі вогнішчамі, якія гуртавалі каля сябе асадніцтва.

Значэньне гэтых свайго роду крэпасьцяў для асадніцтва будзе тым большае, калі возьмем пад увагу іх ролю ў разьвіцьці камунікацыі.

Людзі ў першабытную пару падарожнічалі ў умовах вельмі цяжкіх. Дрыгвяныя балоты, ручаі, палімы перашкаджалі дужа часта абладаваным вазом пасоўвацца наперад. Трэба было расьцярэбліваць або абмінаць пушчы спатыканыя на шляху, *насыпаць грэблі, будаваць масты.* Былі змушаны трымацца праложаных праходаў, бо йнакш у непраходных тапелішчах лёгка было загразнуць, або трапіць у пастку ворага.

Дзеля гэтага вандроўныя шляхі мелі аграмаднае значэньне.

Ведаем добра, што найбольш істотным ў паняцьці дарогі павінна быць яе бясьпечнасьць. Такіх дарог, якія мелі значэньне нятолькі камунікацыйнае, але і стратэгічнае, трэба было сьцерагчы. Гэтую ролю выконывалі гарады-старажніцы.

Вышэй успомненыя ўзгляды да некаторай меры аб'ясьняюць, дзеля чаго з разбудаванымі гарадамі распаложаны ўздоўж спэцыяльных лініяў нп. Вільня, Ліда, Навагрудак, Мір, Несьвеж, Клецк, Пінск, або: Берасьць, Слонім, Несьвеж, Слуцк, Глуск і г. д. Гэта лініі старых камунікацыйных артэрыяў і стыхійнай калянізацыйнай экспансіі.

Сустракаем таксама гарады ўздоўж рэк. Разумеем цяпер іх сэнс. Дзеля таго, што рака была нятолькі карміцелькай, ня толькі шляхам, якім ішло асадніцтва, але і дарогай, якой праходзілі купцы, а таксама і варожыя навалы чужынцаў, — значэньне гарадоў надрэчных зразумелае: зьяўляюцца яны стражніцамі, пільнуючымі пераходаў. Напр. Слонім, Клецк, Слуцк, Глуск, або: Пінск, Тураў, Петрыкаў, Мозыр выконывалі сваю адвечную задачу на Прыпяці.

Праф. Г. Ловмяньскі*) падае, што да XIII в. на Чорнай Русі ня было асобнага княства, затое ведамыя былі гарады-стражніцы, як завязь арганізацыі.

На ўмацаваных месцах з бегам часу былі будаваны дзеравяныя, аблепленыя глінай замкі. У гэтых замках жылі князі. Яны ступянёва арганізавалі насельніцтва, якое шукала ў іх абароны і апекі, гэтым падпарадкавалі яго цалком пад сваё панаваньне. Такім чынам з часам паўстаў г. зв. двор з абаронным замкам і аграмаднымі абшарамі зямлі і валасьці з жыхарамі цалком залежнымі ад пана-валадара замку, якія плацілі падаткі, а таксама былі забавязаны да абароны граніц, маемасьці і дарог.

Пры замках звычайна адбываліся таргі; кружылі тут купцы з заморскімі таварамі. І гэта спрыяла таму, што людзі ахвотна пасяляліся блізка замкаў.

Пачало пасяляцца насельніцтва земляробскае і іншае пры замках, але на такіх эканамічных умовах (як кажа праф. Кутшэба), на якіх пасялялася ў вёсках. Такім чынам на г. зв. прыгарадзьдзі паўставалі пачаткі местаў (гарадоў). Спачатку былі гэта малыя мястэчкі, якіх насельніцтва ня розьнілася ад насельніцтва вясковага; гэтае насельніцтва займалася земляробствам, рамяслом і гандлем. У залежнасьці ад спрыяючых варункаў, з гэтых мястэчак вытварыліся контуры вялікіх местаў. З гэтага бачым яшчэ адну ролю гарадзішчаў: зьяўляюцца яны асяродкамі няраз магутных гарадоў. Усе большыя гарады на г. зв. Чорнай Русі маюць такі пачатак.

Дзеля гэтага, знаходжаньне гарадзішча, або разваліна ў замку мае аграмаднае значэньне для дасьледчыка гарадзкога асадніцтва. Гэта дае ключ для многіх праблемаў урбаністыкі.

Замкі выканалі аграмадную ролю колёнізацыйную. Літоўская экспансія апіралася толькі на гарадох-замках.

Падаўчыя акты, тэстамэнты і фундацыі сьведчаць аб тым, што літоўскія вяльможы трымалі ў сваіх руках маемасьць належачую да Беларусаў. План колёнізацыйны вялікіх князёў літоўскіх згары быў абдуманы: паўстаюць вялікія беларускія пасёлкі, належачыя да Літвіноў.

Родзіцца (як кажа праф. Ловмяньскі) экспансія гаспадарчая на Русь элемэнту памешчыцка-рыцарскага.

Літоўскія кунігасы-князі здабываюць становішчы князёў у беларускіх гарадох. Такая была роля гарадоў пры колёнізацыі літоўскай.

Гэтак паўставалі гарады ў Беларусі і такую, як бачым, выконывалі ролю ў мінуўшчыне.

АЛЬДОНА ПЯЦЮКЕВІЧ

Вільня, дн. 5.II.1937 г.

*) Studja nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego.

Р. Шырма і беларуская песьня ў Вільні

Няма, хіба, у Вільні аніводнага музыкальнага чалавека, які-б ня быў, хоць павярхоўна, азнаёмлены з беларускай песьняй. А яшчэ гэтак нядаўна, менш, можа, як дзесятак гадоў таму, беларуская народная музычная творчасьць была для большасьці культурнага грамадзянства нечым зусім нязнаным.

Бязсумлеву, мы зьяўляемся сьведкамі мамэнту, калі беларуская народная музыка вырушае на здабыцьцё сьвету. Няма людзей музыкальных, якія беларускай песьні ня любяць, ёсьць толькі такія, што яе ня ведаюць; хто раз з ёю пазнаёміцца, астанецца на ўсё жыцьцё пад уплывам яе чару. Гэта відаць яскрава на прыкладах такіх кампазытараў, як Грэчанінаў і Галкоўскі.

Што ж змушае музыкальны сьвет зацікавіцца нашай песьняй, у чым яе найвялікшае характво, на чым палягаюць яе вартасьці і значэньне? Трудна адказаць на ўсе гэтыя пытаньні, так, як трудна ў словах сфармуляваць паняцьці характва і эстэтыкі.

У часы, калі „ўсе песьні ўжо перажыты, усе мэлёдыі перайграны," калі кампазытары ня шукаюць ужо амаль новых мэлёдый здаваліваючыся, часта, чыста тэхнічнай — аркестровай, галасавой, рытмічнай, нават, апрацоўкай старых мэлёдый, — раптам беларуская народная песьня ўносіць у сусьветны музычны фонд" нязьлічанае багацьце сваёй мэлёдыкі, мэлёдыкі арыгінальнай, але ня эксцэнтрычнай, простай, але ня прымітыўнай. У той час, калі кампазытары, шукаючы новых рытмаў заблуталіся ў вульгарных эфэктах сымфонічнай рытмікі, беларуская народная песьня дэмонструе зьдзіўленаму музыкальнаму сьвету сваю багатую арыгінальную рытміку, вольную, амаль, ад сынкопаў, натуральна выплываючую з самой мэлёдыі.

Дзіўным цяпер здаецца, што скарбы беларускай народнай песьні аж да апошніх часоў ляжалі нявыкарыстанымі. Праўда, ведамы гадоў 40—50 таму назад хор Славянскага меў у сваім рэпэртуары дзьве ці тры беларускія песьні („Ці ня дудка мая," "Чаму-ж мне ня пець," „Ня лісточанькі шумяць"), але глыбей беларускай песьняй Славянскі заняўшыся прадусім музыкай вялікарасейскай не зацікавіўся.

Толькі ў пару адраджэнскага беларускага руху асабліва пасьля вайны пайшла ў гару беларуская музыка. Ня будзем гэтым разам вырысоўваць у ва усей шырыні гэты рух, будзем гаварыць толькі аб самым бліжэйшым да нас, — гэта аб Вільні і тут на першае мейсца мы павінны паставіць імя грамадзяніна Грыгора Рамановіча Шырмы.

Гэта ён езьдзячы па беларускіх вёсках сабраў і запісаў некалькі сот беларускіх мэлёдый. Гэта ён сваім запалам і захапленьнем так зацікавіў беларускай песьняй ня толькі вядомага віленскага кампазытара К. М. Галкоўскага, але нават і ўсесьветнай славы расейскага кампазытара А. П. Грэчанінава, які жыве ў Парыжу. Гэта ён стварыў, і пры тым бяз усякіх матэрыяльных дапамог, цудоўны беларускі Хор у Вільні.

І вось дзякуючы гэтаму рэдкаму культурнаму працаўніку, цяпер пазнаёміцца з беларускай народнай песьняй досыць лёгка; маем ужо некалькі багатых зборнікаў, маем такіх гарманізатараў, як Грэчанінаў і Галкоўскі, маем у Вільні цудоўны Хор гр. Р. Шырмы. Грэчанінавым і Галкоўскім гарманізаваны ужо сотні беларускіх песьняў, сотні іх навучыўся і прапяяў Хор Шырмы.

Вялікую і ахвярную працу вядзе гр. Шырма з сваім Хорам, папулярызуючы беларускую народную песьню. Пaціху, бяз крыку і рэклямы, працуюць Шырма і яго Хор, але працуюць старанна, плянова, перадумана. І толькі нямногія з слухачоў, захапляючыся на канцэрце нязвычайнай згоднасьцю і дакладнасьцю выкананьня, высока мастацкай апрацоўкай твораў, цудоўнай па выразнасьці і пачуцьцю дыкцыяй, уяўляюць сабе, якая цяжкая і напружаная праца ўсяго Хору і яго кіраўніка мусіла папярэдзіць канцэртнае выступленьне.

Віленскае музыкальнае грамадзянства, як беларускае, так і польскае і расейскае, належна ацаняе мастацкую вартасьць Хору Шырмы і выконываных ім твораў. Незразумелым зьяўляецца толькі становішча ў справе беларускай музыкі Віленскага Радыё. Праўда, Радыё часам дае магчымасьць сваім слухачом праслухаць беларускія песьні ў выкананьні Хору Шырмы, але вельмі рэдка, і то выключна ў г. зв. „літаратурных аўдыцыях," як іх музычную ілюстрацыю, а не ў самастойных канцэртах.

Словаў „беларусы і беларускі" пры гэтым старанна унікаюць. Каго хочуць ашукаць?

Апошнімі часамі ў польскай прэсе раздаецца шмат галасоў за тым, каб Радыё большую ўвагу зьвярнула на аўдыцыі для вёскі, а ў іх ліку — і на народную музыку. Радыё выразна стараецца гэтыя жаданьні споўніць. Але няўжо кіраўнікі Радыё думаюць, што розныя полькі выконываныя на гармоніцы, з прысьвістываньнем, п'янымі галасамі і з п'янымі выкрыкамі, — гэта і ёсьць народная музыка? Такое, прынамсі, уражаньне мае той, хто слухае „audycje dla wsi", „audycje dla poborowych."

Як-жа далёкая ад п'яных выкрыкаў беларуская народная музыкальная творчасьць! Да беларускіх музыкальных народных твораў трэба падыходзіць так сама паважна, як да твораў найвялікшых кампазытараў і тады характво іх выступіць магутна і яскрава. Выкананьне на 1-шы дзень каталіцкага Ражства чатырмя п'янымі галасамі, да таго яшчэ унісонам, беларускіх калядак — гэта *абраза Характва.*

А калі тыдзень, больш-менш, пазьней, пяяў калядкі Хор Шырмы, калі хвалі радыё па ўсёй зямлі разьнесьлі гукі чароўнай мэлёдыі, гэта было сьвята музыкі: беларускі народ укладаў у агульна-людзкі музычны скарб свой багаты ўдзел.

В. Багдановіч

ПЕСЬНЯ КУЛІКОЎ

Пахне дзёгцем,
потам,
рыжаю аўчынай;
цішыня у хаце згорбленай, старой,
ды гарыць памалу ноч з даўгой лучынай
сьцелючы сасновым дымам і смалой...
Часам вецер дрэвы зачапіўшы гужам
доўга іх пілуе месяца сярпом
і снуе на плоце
белы, сьнежны кужаль,
з доўгай сьнежнай песьняй за сьляпым вакном.
У печы дымна дровы мокрыя пылаюць,
зайцамі кладуцца цені па сьцяне.
Пеніцца сярдзіта, — бульба закіпае
сьнежнаю завеяй
ў чорным сагане.

— Ну, садзіся з намі! —
дзед стары гавора
і акраец хлеба чорнага кладзе. —
Наарпуе сьнегу, бы мяккіны горы,
не праедзеш полем з дровамі нідзе...
Сам відаць далёкі...
не з блізкіх аколіц,
не з пад нашых пэўна саламяных стрэх...
Ды апранен слаба, — недзе зьмерзьнеш ў полі, —
хоць на лаве цесна, перасьпі начлег!
Бачыш: у нас голад,
людзі жывуць бедна,
хлеб на стол кладзецца толькі для гасьцей...
Можа хопіць бульбы з дзён асеньніх медных
да вясны, да першых з выраю гусей...

Час такі нядобры. З першых дзён марозу
моладзі нямала з вёскі узялі.
Шмат раз ужо пэўна
шэрыя бярозы
сьлед іх з белым ветрам
ў полі замялі...
Хочыцца вучыцца ў мове сваей роднай,
лезьлі, дамагаліся грудзьмі...
Я ўжо хутка лягу
пад сасной зялёнай —
што, скажы мне, будзе з нашымі дзяцьмі? —

У кутку, на нарах, на старую кніжку
ціхі шопат льецца
і чупрынаў бель;
сумна з маладзіцай над малой калыскай
ўсхліпывае песьняй
белая мяцель.

—Сьпі, засьні, маленькі...

—Што, мужык на працы?..—
Кажыш, далі роўна яму дзесяць год?!

— ...сьпі, засьні саколік...

А дажджом гарачым
сыпецца ў калыску з вачэй горкі пот...

— Я, стары, таксама з пад страхі сялянскай,
быў і там, дзе сяньня твой гаруе сын...
Шмат сьлядоў пакінуў на дарогах гразкіх,
на скрыпучых струнах
белых палазін...

— ...Сьпі, засьні, маленькі, родненькі саколік!..
Ну ня плач, мой добры!..
Слухай: ля ракі
не мяцель галосіць на заснуўшым полі,
а ў імгле зблудзілі пэўна кулікі...

І стары ўздымае выцвіўшыя вочы.

— Ну, кажы, ці доўга гэта будзе так?
Сеіць усё сеім —
з рана да паўночы, —
каб на нашых нівах красаваўся мак.
А у нас ўсё цёмна, толькі час ад часу
блісьне калі сонца паміж нашых стрэх,
ды сядзім ў паўголад над галодным квасам,
нашы сьцежкі ў полі
замятае сьнег...
Кажыш — ужо хутка выпрастаем плечы, —
кажыш аб шырэйшых нівах,
аб вясьне.
Вось і я, здаецца, вылез-бы з-за печы, —
хай пакліча толькі моладзь і мяне. —

Прыйдуць дні другія. Эх, сівы ты сокал!
пэўна сын твой рана прынясе зару, —
і хацеў-бы моцна, каб з сяўні шырокай
ты тады засеіў нашу Беларусь.

Праўда, сяньня цяжка нам і нашым песьням,
ворагі капаюць шмат
глыбокіх ям,
але сяньня з косаў мы сьціраем плесьні
і загоім заўтра кожны знак і шрам.
Праз вякі балюча ботамі таптaлі
нашу мову, нівы і зары усход.
Але ужо годзе!
Шэрымі мурамі
ня стрымаць сталёвы
сонечны
паход!

За разьбітай шыбай плача вецер суха,
рвуцца пражы ніткі, ў'юцца на калкі...

— ...сьпі, засьні, маленькі...
ці мо' лепш паслухай,
як ў імгле зблудзіўшы плачуць кулікі...

Пахне дзёгцем, потам, рыжаю аўчынай,
цішыня у хаце згорбленай, старой;
ціха дагарае ноч з доўгай лучынай
сьцелючы сасновым дымам і смалой.
Пад разьлівы песьні хмарыць сон гарачы...

— ...сьпі, засьні мой добры...
слухай... з над ракі...

Ды і мне здаецца, што ў імгле, няйначай,
не мяцель, а плачуць
недзе
кулікі...)*

М. ТАНК

Вільня, 12.XII.1936.

*) Верш гэты прысьвечаны Дню Беларускай Культуры.

НА ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

13.XII.1936 г.

Праз цемру, імглу, бездарожжа,
цягнуліся нашы гады;
пад бурай, віхрамі і дожджам
расьлі і мацнелі рады.

Рады нашых шэрых герояў,
што сонца у песьнях нясуць,
што ў цемры — сьвятлянай душою,
як сьветачам чысьцяць наш пуць.

Што роднае слова, як зёрны,
кідаюць у душы братоў
і словам іх будзяць і кормяць,
як хлебам зьвінячых палёў.

Я сёньня ім песьню складаю,
пра чын іх ахвярны пяю
і птушкай крылатай па краю
пушчу гэту песьню маю.

Шырокае поле і далі,
прастор палатняных дарог —
напеў гэты ім калыхалі
пад коўдрай вяковых зьнямог.

Запраўды было тут пагана,
і цёмна, і жутка кругом;
душа жыла птушкай спужанай,
жыцьцё было — вечным ярмом.

Старыя курганы былінай
няраз яшчэ будуць цьвісьці,
як чорнае гора крапівай,
расло у прыгонным жыцьці.

Тут шчасьце цьвіло толькі ў ночы,
купальскаю кветкай ў бары,
дарма падымаліся вочы,
шукаючы ў небе зары.

Маўчала і неба, і зоры...
маўчаў анямеўшы прастор;
нядоля была прыгаворам
і ткала пракляцьця узор.

Тут сумна пляліся дарожкі
між ніў залацістых палёў,
пляліся ад вёскі, да вёскі,
як доля, як лёс мужыкоў.

Ішлі па іх сумныя жнеі
на панскі загон працаваць;
ад песьняў тужлівых нямелі
палі, пералескі і гаць.

Ды песьні цягучага болю
замкнутых ня ўзрушылі воч;
на душах ляжала няволя,
на вочах зьнямога і ноч.

Цягнуліся моўчкі нямыя,
як слота у восень гады,
з жабрацкаю песьняй сьляпыя
блудзілі па вёсках дзяды.

Але нарадзілісь Лявоны,
з бунтарным агнём у душы,
і зорамі палкія словы
пачалі лунаць у цішы.

І песьню другую зладзілі,
зайгралі на струнах другіх —
і радасьць, і сум абудзілі —
тугу і парывы жывых.

Прывет Вам сяўцы неразвонаў,
прывет Вам ад вёсак і ніў! —
за шчырае, роднае слова —
за чын і ахвярны парыў.

М. МАШАРА

Дзень Беларускай Культуры ў Вільні

Да памятных дзён з беларускага культурна-грамадзкага жыцьця ў Вільні трэба залічыць „Дзень беларускай культуры", урачыста адсьвяткаваны 13-га сьнежня 1936 г. Трэба жадаць, каб гэты дзень стаўся пачаткам прыгожай традыцыі ладжаньня гэткіх імпрэз кожны год. Думка наладжаньня гэтага асаблівага нацыянальнага сьвята паўстала ў віленскіх беларусаў у сувязі з праектаваным адзначаньні юбілеяў беларускіх культурна-грамадзкіх арганізацыяў і установ, а так-жа асоб, што сваей працай прычыніліся да развою беларускага культурнага будаўніцтва. І так у мінулым 1936 г. прыпалі юбілеі: — 15-я ўгодкі Таварыства Беларускай Школы, 10-я Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, 15-я Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча, 10-я Беларускай Друкарні ім. Францішка Скарыны, юбілеі паэтаў: 30-я ўгодкі літаратурнай дзейнасьці народнага паэта Якуба Коласа, 20-я гадаўшчына сьмерці паэткі Цёткі, 10-я ўгодкі сьмерці Казімера Сваяка. Юбілеяў, як бачымо, сабралося. Практычныя мамэнты, матарыяльная ўбогасьць беларускага грамадзянства, а так-жа ідэова-маральныя дзейнікі прамаўлялі за тым, каб калі ня ўсе гэныя юбілеі, то некаторыя, адзначыць разам, адначасова і супольна. Арганізатарамі гэткага супольнага сьвяткаваньня і афіцыяльна адказнымі за яго мелі быць Бел. Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускай Школы. Нажаль да рэалізацыі гэткай прыгожай канцэпцыі не дайшло... Знайшліся праціўнікі... Сьвяткаваньне адбылося з глездзішча арганізацыйнага ў другой канцэпцыі. Рэпрэзэнтанты незалежнага беларускага грамадзянства — староньнікі супольнага сьвяткаваньня — ўтварылі спэцыяльны Камітэт Сьвяткаваньня, які і наладзіў сьвяткаваньне пад назовам „Дзень Беларускай Культуры".

Урачыстая акадэмія адбылася ў гасьціннай залі літоўскай гімназіі імяні Вітаўта Вялікага, пры вуліцы Дамброўскага № 5, запоўненай народам. На подыюм, пад гістарычнай беларускай Пагоняй, засеў за прэзыдыяльным сталом Камітэт Сьвяткаваньня ў складзе: С. Паўловіч, Кс. А. Станкевіч, М. Машара, М. Танк, Р. Шырма, А. Клімовіч, П. Сяргіевіч, Я. Шутовіч і М. Канцэлярчык. Акадэмію адчыніў адказны кіраўнік ейны інж. А. Клімовіч.

Праграма акадэміі з увагі на об'ектыўныя перашкоды агранічылася да ўступнога слова — прамовы Кс. Адама Станкевіча, прывітаньняў і вокальнага канцэрту — выступленьняў Хору грам. Р. Шырмы і сьпеву саліста-тэнара Міхала Забэйды-Суміцкага.

Прамова

Кс. А. Станкевіч на пачатку сваей прамовы прадставіў агульны зьмест паняцьця культуры. — „У ім — кажа прамоўца — скрыта ўсё тое, што так бязупынна і прагавіта здабывае і твора душа чалавека, усё тое, што азначае вартасьць і імкненьні

жыцьця людзкога. Навука, літаратура, мастацтва, музыка, рэлігія, а так-жа датасаваньне гэтага ўсяго да жыцьця чалавечага, каб яно было радасным, каб мела сэнс свой і каб было дастойным чалавека — ўсё гэта разам узятае крыецца пад гэным магічным назовам: культура.“ — І спыніўшыся крыху ў агульных словах на творчых пладох душы людзкой, на падарожных шляхох культуры чалавечай, якія давялі — „ад іскры, выкрашанай з камяня аж да іскры электрычнай і да этэрычных фаляў радыёвых, ад сьвечкі ці газьніцы аж да раскошных электрычных лямпіёнаў, ад простай народнай песьні аж да вялікіх паэматаў і аж да сымфоніі музычнай, ад вузкага, тупога й нявольніцкага фэтышызму аж да бязбрэжнага, вольнага і глыбокага монотэізму, ад прымітыўнага ражна дзеравянага аж да скомплікаванага трактара, ад жыцьця стадовага, дзікога і поўнага соцыяльных супярэчнасьцяў і крыўдаў аж да сучасных грамадзянстваў, апёртых на вольнасьці і грамадзкай справядлівасьці“ — прамоўца схарактарызаваў розныя віды культур даўнейшых і культуру сяньняшняй пары: — „Гісторыя знае розныя віды культуры залежна ад эпохі, расы, нацыі, клясы, ад адзінак, якія яе твораць, ад таго ўрэшце асяродзьдзя, у якім грамадзянства якое ці адзінка прабывае. Гісторыя знае культуры рэлігійныя, у якіх галоўным матывам і характарам творства чалавека ёсьць рэлігія, знае так-жа гісторыя культуру капіталістычную, буржуазную, якая мае характар пэўнай выключнасьці, недаступнасьці для шырокіх масаў, якая мае характар свайго роду клясавасьці... сяньня культура шукае сабе новых шляхоў, новых дарог...—яны ідуць у кірунку праблемы нацыянальнай і адначасна соцыяльнай. Вызваленьне прыгнечаных нацыяў і соцыяльных клясаў — гэта галоўныя мэты сучаснага грамадзянства, а дзеля таго ў гэтым кірунку адбываецца і культурнае творства сяньняшняга чалавека.“ —

Аднак старыя культуры ня ўміраюць цалком: — „Вартасьці агульна-людзкія і вечныя, якія ёсьць у кожнай культуры, астаюцца назаўсёды... І сяньняшняя культура, якая творыцца пад знакам нацыі і соцыяльнай праблемы — іменна зьяўляецца гэнай новай вартасьцяй для ўсяго чалавецтва.“ —

Далей прамоўца спыніўся на агульнай агаворцы прычыны і ўплываў на старую беларускую культуру культур візантыйскай і лацінскай, адзначыў расьцьвет старой беларускай культуры ў XVI в., яе клясавы, баярскі характар, прычыну яе заняпаду і прыступіў да агаворкі ролі романтызму XIX в. для беларускага народу і яго культуры.

Пад уплывам романтызму тварылася новая беларуская культура і беларускі рэнэсанс, які паводле прамоўцы пачаўся нядаўна, бо найбольш 45 год таму — ад часу выхаду ў сьвет „Беларускай Дудкі“ Багушэвіча, з ейным клічам: „Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі“.

Рэнэсанс беларускі ўжо шмат чаго даканаў: — „Сяньня ўжо ўва ўсіх галінах жыцьця беларусы працуюць на ніве роднай культуры і часта цалком паважныя пакідаюць вынікі гэтай працы. Ужо беларусы сяньня могуць пахваліцца здабычамі ў навуцы, у мастацкай літаратуры, у музыцы, у мастацтве агулам. Праўда, у некаторых галінах культурнага творства мы яшчэ толькі ў пачатку, у некаторых яшчэ дабіліся нямнога, але затое ў некаторых асягнулі пункты роўныя з народамі старых культураў. Гэткімі культурнымі асягненьнямі можам мы пахваліцца ў паэзіі. Нашыя вялікія песьняры Янка Купала, Якуб Колас і інш. сьмела могуць раўняцца з вялікімі клясыкамі эўрапэйскіх народаў. Сілы і ўзоры для свайго культурнага творства беларусы чэрпаюць з народных крыніц.“ —

Канчаючы сваю глыбока прадуманую, зьместоўную і сынтэтычную прамову, Кс. А. Станкевіч падчыркнуў значэньне для беларусаў „Дня Беларускай Культуры“ — гэтага сьвята беларускага творчага духа.

А сьвята гэтае мае значэньне і з гледзішча практычнага і агульнага, прынцыповага, а так-жа з гледзішча карысьцяў з увагі на іншыя народы: 1. У 1936 г. прыпадалі юбілеі некаторых беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў і установ і асоб: — „Вось-жа дзень беларускай культуры — кажа Кс. Станкевіч, — які сяньня сьвяткуем, мае сваей мэтай адзначыць ня толькі здабычы беларускай культуры агулам, але так-жа і гэтыя ўсе... сёлетнія юбілеі.“ 2. — „Гэтае сьвята дае магчымасьць углыбіцца ў тайніцу культуры агулам, лепш пазнаць яе чарадзейскія вартасьці і запаліцца да далейшай творчай культурнай працы.“ — 3. — „Нішто так ня збліжае народаў між сабой, як узаемнае пазнаньне культурных цэннасьцяў кожнага з іх“. —

Апошнія словы прыгожай прамовы Кс. Станкевіча былі пажаданьнямі, каб Дзень Беларускай Культуры быў пачаткам сьвяткаваньня гэткіх дзён кожнага году.

Прывітаньні

Віталі Беларусаў з нагоды іхняй вялікай урачыстасьці прадстаўнікі братніх народаў: — ад украінцаў — прадстаўнік Украінскай Парлямэнтарнай Рэпрэзэнтацыі пасол Троян, ад Літоўцаў— дырэктар Шыкшніс. Першы ў моцных і сардэчных словах выразіў нязьменнасьць добрых адносінаў між Украінцамі і Беларусамі, падчыркнуў вялікія вартасьці беларускай культуры для тварца гэтай культуры — беларускага народу — і ягоных вызвольных імкненьняў, — а так-жа для агульна-людзкай справы, і для украінскага народу ў асобнасьці. — У канцы прамоўца зычыў памыснага далейшага развою беларускага народу на шляху культурнага будаўніцтва. — Дырэктар Шыксніс падчыркнуў гістарычны факт супольнасьці старой культуры Беларусаў і Літоўцаў у мінуўшчыне, — у пару Вялікага Княства Літоўска-Беларускага, — і выразіў пажаданьне, каб новая беларуская культура, якой тварцамі на грунце літаратуры зьяўляюцца Купала

і Колас, памысна разьвівалася, прысвайваючы вартасьці і агульналюдзкай культуры.

Тэлеграфна і пісьменна віталі віленскіх беларусаў — беларусы з краю і з-заграніцы (Бэрлін, Рыга, Коўна, Прага).

Канцэрт

Выражэньнем вартасьцяў беларускай культуры, паказам вышыняў беларускага творчага духа ў галіне музычна-вокальнага мастацтва быў канцэрт. Арганізатары, лічучыся з вонкавымі перашкодамі, далі нявінны паводле свайго зьместу рэпэртуар — многа народных мэлёдыйных песень і песень з свабоднай музычнай творчасьці на словы нашых паэтаў. Канцэрт складаўся з трох частак. Пад кіраўніцтвам слаўнага рэгента і няўтомнага беларускага культурнага дзеяча грам. Р. Шырмы ведамы ягоны Беларускі Хор выканаў першыя дзьве часткі: у першай кантату К. Галкоўскага на словы М. Танка, народныя песьні: „А мне трудненька“ — К. Галкоўскага, „Зялён гай“ — А. Грэчанінава, „А ў полі вярба“ — А. Сьвешнікава, „Па саду хаджу“ — К. Галкоўскага, „Кукавала зязюлька“ — А. Грэчанінава і песьню „Вясна“, муз. К. Галкоўскага, словы М. Васілька, а ў другой частцы: — бадзёрую песьню „Усе разам“, муз. М. Анцава, словы Я. Купалы, народную „Ой гыля, гыля гусі вадою“ — А. Грэчанінава і цудоўную сюіту „Каханьне“ (дзесяць народных песьняў) праф. К. Галкоўскага.

Беларуская песьня, дзякуючы артыстычнаму выкананьню Хору, пры дасканальным акампаньямэнце праф. К. Галкоўскага, асягнула вышыні хараства. Запоўненая слухачамі (больш паўтысячы) аўдыторыя была зачараваная і свой энтузіязм і задаваленьне з перажываных эстэтычных эмоцыяў выражала бурнымі воплескамі ў чэсьць выканаўцаў.

Трэцюю і апошнюю частку канцэрту запойніла выступленьне солё артыста міланскай і пазнанскай опэры Міхала Забэйды-Суміцкага. Гэты высокай клясы эўрапэйскі артыст-чарадзей пры акампаньямэнце праф. К. Галкоўскага выканаў папулярна-апрацаваныя А. Грэчанінавым чатыры беларускія народныя песьні: „Ляціць сарока“, „Конь бяжыць“, „Шчука-рыба ў моры“, „Ой, рана куры запелі“ і з свабоднай творчасьці чатыры рамансы: тры на словы Я. Купалы: „Ты прыйдзі“, муз. Чуркіна, „Лета“ — муз. Аладава, і „Абнімі ты мяне“ — муз. К. Галкоўскага і адзін на словы Ясакара: „Ці грэх цябе любіць“ — муз. К. Галкоўскага.

Артыст цудоўна перадаў, як народныя песьні, так і песьні з свабоднай творчасьці. Слухачы, дзякуючы вялікім здольнасьцям артыста, здаецца першы раз яшчэ ў Вільні адчулі чар і хараство беларускай песьні, выкананай солё. Зачараваная заля хвялявала. Бурным авацыям ня было канца. Беларуская моладзь, поўная захапленьня, абнясла на канчатак артыста па залі.

Канцэрт пакінуў па сабе моцныя, незабыўныя ўражаньні.

Аб „Дню Беларускай Культуры“ шырока пісала прэса.

Віленскія расейскія газэты — „Русское Слово“ і „Наше Время“ ў № 297 з дня 18.XII.36 г., даючы добрую ацэну выступленьняў Хору і Міхала Забэйды-Суміцкага, вось што напісала:

„Хору Шырмы ўдалося паказаць свае артыстычныя дасягненьні і нязвычайнае багацьце беларускай народнай музычнай творчасьці. Гэты хор, бяз сумліву, адзін з лепшых (калі не найлепшы) з віленскіх хораў. Трудна сказаць, што болей захапляе слухача, цудоўныя галасы харыстых ці зьдзіўляючая дасканальнасьць апрацоўкі, нязвычайная пранікаючая душу (пронікновенная) глыбіня трактоўкі выкананых твораў. Немагчыма сказаць, якая з песень найболей спадабалася слухачом: кожная ў выкананьні хорам была маленькім шэдэўрам.

Надта спадабаўся публіцы артыст опэры, тэнар М. Забэйда-Суміцкі. Прыгожы, мяккі і чысты голас, шляхотная, культурная манера сьпеву, — вось галоўныя дастоінствы артыста.

Шкада, што шырокая публіка надта рэдка можа знаёміцца з беларускай музыкай“.

А вось голас жыдоўскай прэсы. У справаздачы з беларускай урачыстасьці, „Вільнэр Тог“ з дня 16.XII.1936 г., № 287, напісана:

...„Калі афіцыяльная частка, як відаць з даволі важных прычын, адбывалася як-бы на палавіну адчыненым ротам, то канцэртны аддзел быў дадзены ўсім сэрцам: чаго не дагаварылі, тое дапялі. Беларускія народныя песьні расказалі аб беларускім народзе, аб яго душы, цярпеньнях, радасьцях больш, як гэта маглі-бы сказаць найдаўжэйшыя прамовы.

Тэксты вялікіх беларускіх песьняроў Купалы, Ясакара і маладых віленскіх паэтаў М. Танка, М. Васілька, ясна гаварылі за сябе, як высака стаіць беларуская культура і літаратура.

Хор Шырмы прыемна слухаць. Чатыры дзесяткі хлапцоў і дзяўчат, кіраваныя ўмелай і чулай рукой дырыгента вельмі добра сьпеты. Іх ціхае pianissimo разыходзіцца, як бальзам па ўсім целе...

Апошнюю частку канцэрту выпаўніў саліст М. Забэйда-Суміцкі. Гэты артыст мае лірычны тэнар і так прыгожа пяяў, што публіка на руках вынесла яго на залю і доўга рабіла яму авацыі“.

Прыхільныя водгукі знаходзяцца на бачынах і іншай прэсы — украінскай, літоўскай і польскай.

Сапраўды, „Дзень Беларускай Культуры“ быў вялікім сьвятам артыстычных дасягненьняў беларускага творчага духа ў галіне музыкі і песьні, быў радасьцю і беларускаю нацыянальнаю гордасьцю.

Я. Ш.

КНІГАПІС

Mikolas Biržiška — „Chodkevičiai," „Chodzka," „Chominskiai", Kaunas 1936.

Гэта адбіткі з Літоўскай Энцыклёпэдыі, якая цяпер выдаецца ў Коўне. Аб Хадкевічах і аб Ходзьках артыкулы зьмешчаны на 14 бачынах, а аб Хамінскіх на 7. Фармат адбітак 25×17. Тэкст разьмешчаны ў дзьве шпальты.

Усе гэтыя артыкулы праф. М. Біржышка апрацаваў вычэрпываючa, дужа падрабязна й безстароннa. Ён заўсёды зазначае, хто з асобаў гэных трох родаў з кім найбольш быў зьвязаны: з літоўцамі, беларусамі ці ўкраінцамі, зазначаючы адначасна дадатнюю й адʼёмную гэтых асоб дзейнасьць. Так напрыклад аб Рыгоры Хадкевічу ў адбітцы зазначана, што ён шырока праводзіў прасьветную сярод беларусаў акцыю, што прыняў уцёкшых з Масквы друкароў: Івана Фёдарава і, быўшага друкара Скарыны, беларуса Пятра Мсьціслаўца, што й сам залажыў у Заблудаве друкарню, у якой надрукаваў у беларускай мове Эвангельле, Псалтыр, Апостал. Узноў-жа гаворачы аб родзе Хамінскіх, праф. М. Б. падчырківае прыязныя да беларусаў адносіны наймаладзейшага з гэтага роду Людвіка Хамінскага, сучаснага культурнага польскага дзеяча ў Вільні, зазначаючы адначасна, што яшчэ прад вайной у Альшэве, Лынтупскай воласьці (двор Хамінскіх), за часоў бацькі Людвіка была заложана польская школа, каб польшчыць беларускіх дзяцей.

Беларускі гісторык, дасьледываючы мінуўшчыну свайго народу, і спатыкаючыся ўсьцяж з дзейнасьцяй Хадкевічаў, Ходзькаў і Хамінскіх, у працы праф. М. Біржышкі можа знайсьці шмат чаго сабе патрэбнага

Род Хадкевічаў выводзіцца з XIII ст. З іх М. Б. апісаў 16 асоб.

Род Ходзькаў ведамы ўжо ў XIV ст. У адбітках апісана 14 асоб.

Першы Хамінскі (Федзька) ведамы ў 15 ст. З гэтых М. Б. апісаў — некаторых дужа коратка — 17 асоб.

Ад. Ст.

Хведар Ільляшэвіч: **Захварбаваныя вершы. Вільня 1936. Бач. 30.**

Новы зборнічак вершаў Хведара Ільляшэвіча даволі старанна і прыгожа выданы, які нядаўна паявіўся з друку пад вышэйуспомненым назовам, зьяўляецца вельмі паважным зьявішчам у творчасьці нашага маладога паэта.

З пасярод сучаснай беларускай паэзіі ярка выдзяляецца творчасьць Ільляшэвіча ўжо сваей тэматыкай, акая амаль выключна зьяўляецца аснаванай на матывах мяшчанскіх і інтэлігенцкіх. Вясковая, салянская стыхія, дамінуючая ў іншых нашых

паэтаў, агранічываецца ў Ільляшэвіча да стылістычных прыёмаў, як прыраўнаньняў, мэтафараў і інш., якія паэт часта будуе на матарыяле, узятым з вясковага жыцьця. Гэтак побач з такімі зваротамі, характэрнымі для паэзіі мяшчанска-інтэлігенцкай, як: „У небе хмары ўюцца *афішамі,* „Завесіў дожджык на тварах *траур,*" „Ціха імжыць вечар *бэнгальскімі агнямі* ў тумане," „На *клявішах* вялізных дамоў" і г. п., розныя зьявы ці прадметы з мястовага жыцьця любіць аўтар апісываць пры помачы прыраўнаньня ці замены іх зьявамі і прадметамі з сялянскага асяродзьдзя. І так мястовыя аўтабусы прадстаўляюцца ў выбражэньні паэта, як „сена вазы," шэрыя, гарадзкія вуліцы — як „рыжыя іржышчы," панурай восеньню „маячаць ў дыме вуліц—*копы жыта*—плачкі," а вясною „вершы *квецьцем чаромхі* беласьнежныя электры гнуць" і г. д. Трэба адцеміць, што гэты вясковы элемэнт у мэтафарах Ільляшэвіча вельмі ярка адрозьніваецца ад агульнага мястовага фону яго вершаў, выразна конкрэтызуе абраз, што з гледзішча артыстычнага ёсьць вельмі ўдалым і пажаданым.

Але нятолькі тэматыкай адрозьніваюцца вершы Ільляшэвіча ад агульнага характару сучаснай нашай паэзіі. Паколькі гэтая апошняя вызначаецца нязвычайна глыбокай эмоцыянальнасьцю — ад мяккіх і далікатных пачуцьцяў (прыкладам Арсеньнева) аж да магутнай дынамікі бунту (Танк, Машара і інш.) — патолькі спакойны, зраўнаважаны верш Ільляшэвіча вельмі рэдка прамаўляе да нашай пачуцьцёвасьці. І ў тых, праўда нямногіх прыпадках, калі аўтар не стараецца нястачы эмоцыянальнасьці замяніць іншымі эстэтычнымі вартасьцямі, ня менш важнымі за першыя, верш ягоны робіцца сухі і „прозаічны," што бязумоўна трэба ўважаць за паважную загану.

Але, на шчасьце, як я ўжо зацеміў, такія прыпадкі зьяўляюцца рэдкімі. Вершы Ільляшэвіча, пераважна пазбаўленыя пачуцьцёвасьці, вельмі моцна прамаўляюць да нас містэрнай вобразнасьцю, часамі дзеюць на наш слух цікавай і глыбока ўматываванай артыстычна рытмікай. Абразы ягоныя нязвычайна фрагмэнтарычныя й згушчаныя, але, дзякуючы вялікай мэтафорычнасьці стылю, зьяўляюцца выразнымі, плястычнымі, якія ярка зарысоўваюцца ў нашым выбражэньні і выклікаюць адпаведны настрой. Гэтак абраз асеньняга неба малюе аўтар усяго двамя радкамі:

> Неба — сіні плякат —
> серабрыстымі ніткамі выткала восень

але абраз гэты, дзякуючы ўдалым мэтафарам, ёсьць пукаты і маляўнічы, і калі-б гэтак поўна нарысаваць яго мовай звычайнай, простай, трэба было-б патраціць аж некулькі строфак. Вось-жа гэтая эканомія слоў і фрагмэнтарычнасьць зьяўляюцца ў паэзіі вельмі важнай рысай, бо яна пры чытаньні твору пабуджае нашае выбражэньне да працы з мэтай поўнага адтварэньня абраза. Нярэдка так-жа паслугоўваецца Ільляшэвіч эфэктамі руху, як гэта можна асабліва бачыць у вершах „У небе зоркі — папя-

роскі,“ „Цягнікі і станцыі,“ альбо ў наступным абразе мястовага вечара:

Гмахі плывуць у блакітныя змрокі,
быццам у прыстань на ноч караблі —
рушылі цені вячорныя ў скокі,
зоркі да дахаў бліжэй падплылі.

Наагул элемэнт руху грае адну з вайважнейшых роляў у Ільляшэвічавай творчасьці, які ў ладнай меры асягваецца пры помачы адпаведнай рытмікі. Гэтак вышэйзацытаваная строфка сьмелым і больш менш роўнамерным рытмам із спэцыяльна сільнымі націскамі ў прыраўнаньні да складоў ненацісканых выклікае ўражаньне роўнамерна адрывістага руху — адплываньня гмахаў „у блакітныя змрокі,“ скокаў вячорных ценяў і падплываньня зорак да дахаў. Узноў-жа ў успомненым вершы „Цягнікі і станцыі“ адпаведная рытмічная форма выражае бег цягніка, як можна гэта абсэрвавацъ у наступным фрагмэнце:

Ў гэтай далі сонечнай —
калыхацца сьпевамі —
птушкай лёгкакрылаю ў небасхіле млецъ.
Ў гэтай далі сонечнай —
каласамі сьпелымі —
сінім летнім вечарам ціха шапацець.

Гэтак усе мастацкія прыёмы, ужываныя ў вершах Ільляшэвіча, як кампазыцыя, стыль, рытміка і інш., не зьяўляюцца ўсяго толькі вонкавымі „прычэпкамі , як у творах многіх іншых паэтаў, але ўсе яны іграюць у творы выразныя артыстычныя функцыі, служаць тым ці іншым артыстычным мэтам. Сьведчыць гэта аб мастацкіх здольнасьцях і высокай артыстычнай культуры нашага маладога пясьняра. Але адначасна гэтая вялікая функцыянальнасьць мастацкіх прыёмаў Ільляшэвіча, фрагмэнтарычнасьць і згушчанасьць яго абразоў, мэтафорычнасьць мовы зьяўляюцца прычынай, што творы яго ёсьць „незразумелыя“.

Уявіўшы сабе неабходнасьць культурнага поступу роўналежна з іншымі народамі, Ільляшэвіч не павінен зьнеахвочывацца тым, што многія наракаюць на „незразумеласьць“ яго вершаў, а йсьці вытрывала й консэквэнтна выбраным шляхам. Апошні зборнічак яго вершаў, які, у прыраўнаньні да двух папярэдніх зборнікаў („Веснапесьні“ 1929 і „Зорным шляхам“ 1932), ёсьць вялікім крокам наперад, сьведчыць, што зьяўляецца ён на правільнай дарозе і зможа прынесьці вялікую карысьць для беларускай літаратуры. Астаецца толькі пажадаць, каб, побач із дасюлешнімі позытыўнымі вартасьцямі сваей творчасьці, стараўся ён у далейшым зьвярнуць большую ўвагу на эмоцыянальны яе падклад і расшырыць круг яе сюжэтаў, шырэй ахопліваючы жыцьцё вёскі і грамадзкія патрэбы народу, бо якраз гэтыя асаблівасьці зьяўляюцца найбольш блізкімі і дарагімі для беларускага чытача.

Я. В—іч

ХРОНІКА

Віленскі ваявода ў студні месяцы зачыніў Т-ва Беларускай Школы і Т-ва Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. Урады т-ваў зламылі Міністру Унутраных спраў скаргі.

Надчым працуюць нашыя паэты? Максім Танк кончыў дня 3.II. паэму „Нарач“. Паэма складаецца з сямёх частак, з якіх пяць першых ужо надрукаваны ў нашым часапісе. Гэта першы том паэмы. Паэт праектуе напісаньне другога і трэцяга тому. Напісаная паэма „Нарач“ ёсьць багатым укладам у беларускую мастацкую літаратуру, і займае ў ёй адно з першых месц. Цяпер паэт выканчывае прозаічнае апавяданьне і рыхтуе да друку другі зборнік вершаў — першы „На этапах“, як ведама, улады сканфіскавалі; адначасна-ж працуе паэт над новай паэмай, сюжэт якой узяты з сялянскага жыцьця.—Натальля Арсеньнева прырыхтавала да друку новы зборнік вершаў і паэм п. н. „Жоўтая восень“ і цяпер працуе над паэмамі з цыклю „Зачараваны Кут“, гдзе выкарыстаны будзе беларускі народны фольклёр. — Міхась Машара прыгатаваў да друку новы зборнік вершаў п. н. „З пад стрэх саламяных“. — Хвёдар Ільляшэвіч працуе над раманам „Туман“. Том першы раману ўжо скончаны. Гэты-ж аўтар выдаў нядаўна зборнічак сваіх вершаў п. н. „Захварбаваныя вершы“, а цяпер мае выдаць асобным зборнікам свае апавяданьні. — Ніна Тарас, наймалодшая з многа абяцаючым талентам паэтка, піша дробныя вершы, працуе таксама над даўжэйшай паэмай.

17-га студня сёлета адбыўся ў Вільні аўтарскі вечар Натальлі Арсеньневай. Кароткі агляд паэтыцкай творчасьці Арсеньневай даў др. Ст. Станкевіч а сама аўтарка прачытала чарод новых сваіх вершаў. Пасьля Вечару адбылася „літаратурная гарбатка“ — скромнае прыняцьце для паэткі. Вечар і „гарбатку“ арганізавалі Беларускі Студэнцкі Саюз і Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце.

Літаратурныя пятніцы. У апошнім квартале м. г. і ў пачатку бягучага году ў памешканьні рэд. „Калосься“ адбылося дванаццаць літаратурных зборак, г. зв. „літаратурных пятніц“. Зборкі арганізаваны нашым часапісам. У праграму зборак уходзілі: чытаньне рукапісных і друкаваных твораў нашых паэтаў і пісьменьнікаў, дыскусія над імі і агаворка праблемаў з літаратуразнаўства.

Ведамы кампазытар К. Галкоўскі апрацаваў апошнім часам на мяшаны хор багатыя і цікавыя з боку музычнага і даступныя для нявялікіх хораў чатыры беларускія народныя песьні: „Там пад гаем зялёненькім“, „Ой, маці, маці“, „Пайшла дзяўчынка ў лес за грыбамі“ і „Ой, чумача, чумача“. Мэлёдыі і тэксты гэтых песень запісаў наш слаўны рэгент Р. Шырма ў в в. Шакуны і Кацёлкі, Пружанскага пав.

У Беларускім Навуковым Таварыстве 22 студня адбылося першае пасьля калядных сьвятаў паседжаньне Літаратурна-Мастацкае Сэкцыі. На паседжаньне была запрошана, як госьць, паэтка Н. Арсеньнева, каторая прыехала на нейкі час пагасьціць у Вільню.

Старшыня Сэкцыі др. Ст. Станкевіч зрабіў даклад аб найнавейшай творчасьці паэткі. У сувязі з закранутымі дакладчыкам пытаньнямі разьвярнулася цікавая дыскусія аб арганічнай сувязі, якая існуе паміж стылем і тэматыкай паэзіі і індывідуальнасьцяй аўтара. Абгаворана была такжа вялікая мастацкая вартасьць народнае паэзіі. У дыскусіі выступалі паэты — Арсеньнева і Максім Танк.

На заканчэньне Танк прачытаў з рукапісу V, VI і пачатак VII-ае часткі сваей паэмы „Нарач“.

Учасьнікі паседжаньня на памятку аб гасьцяваньні Н. Арсеньневай сфатаграфаваліся разам з ёю.

== Прывезеныя дырэктарам Беларускага Музэю памяткі з XII стагодзьдзя з Давід-Гарадка выстаўлены ў Музэі дзеля публічнага агляду. Тутака ёсьць чарапкі глінянага судзьдзя і скураныя туфлі, знойдзеныя ў княжых трунах. Туфлі зрэканструаваў (на рысунку) беларускі мастак П. Сергіевіч.

== За 1936 год лічба асоб, аглядаўшых Беларускі Музэй ім. Івана Луцкевіча, дайшла блізу паўтары тысячы (точна: 1494), у тым — 64 экскурсіі. У леташнім годзе былі толькі 903 асобы, у тым — 42 экскурсіі.

== 28.II у залі гімназіі Жыгімонта Аўгуста ў Вільні адбыўся вечар песьні. Аб беларускай народнай песьні рэфэрат прачытаў гр. Цытовіч. Пад ягоным кіраўніцтвам хор вучаніц з гімназіі Арэшчыхі і вучняў з правасл. духоўн. сэмінарыі прапяяў, пераважна унісоно, беларускія народн. песьні з цыклю „нарачанскіх“.

== 3-га сакавіка ў залі беларускай гімназіі ў Вільні адбыўся канцэрт-вечар, арганізаваны Агульна-Школьнай Радай гімназіі. Праграма канцэрту: беларускія народныя песьні ў выкананьні хору гр. Р. Шырмы, вязанка беларускіх мэлёдыяў у выкананьні духовай гімназіяльнай аркестры, стылізаваныя беларускія народныя танцы — „Лявоніха“, „Юрачка“ і „Чарот“, выкананыя пад кіраўніцтвам мгра Я. Хвораста, балет вучаніц I клясы гімназіі і інш.

== Дзеля ўшанаваньня памяці вялікага паэта А. С. Пушкіна з нагоды 100-годзьдзя ад дня яго сьмерці, супрацоўнікі нашага часапісу 14.III арганізавалі вечар, на якім праф. В. В. Багдановіч прачытаў рэфэрат, паэт М. Танк прачытаў свае пераклады вершаў Пушкіна на бел. мову, а мгр. Я. Хвораст прадэклямаваў вершы паэта ў арыгінале.

—о—

== 6-га лютага беларуская калёнія ў Варшаве зарганізавала ў будынку фільгармоніі канцэрт-вечарыну. У праграме канцэрту — бел. песьні.

== 27.II.37 у варшаўскай кансэрваторыі адбыўся канцэрт песьні. Выступаў слаўны тэнар Міхась Забэйда-Суміцкі. З прапяяных ім песень, найлепш спадабаліся публіцы песьні беларускія.

—о—

== А. Ц. Грэчанінаў у Рызе. Праездам з Францыі ў Фінляндыю і Швэцыю, 3.III затрымаўся на некалькі дзён у сталіцы Латвіі, Рызе, слаўны на ўвесь сьвет і заслужаны для беларускага музычнага творства кампазытар А. Ц. Грэчанінаў. 5.III адбыўся тамака ягоны аўтарскі канцэрт. Сярод выкананых твораў была і беларуская народная песьня „Зязюлька“, якая сабрала найбольш воплескаў. Беларусы ня могучы кампазытара прывітаць у сваей грамадзе, пайшлі на канцэрт і там гэта зрабілі ахвяроўваючы публічна кампазытару букет кветак і памастацку аздоблены беларускім арнамантам адрыс з подпісамі рыскіх беларусаў. Арнамант і літары на адрысе намаляваў беларускі мастак П. Мірановіч.

—о—

== Беларускае арганізаванае жыцьцё ў Літве. — „Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва ў Літве“ — заснавана 5.II.1932 г. у Коўне. Аддзелы Т-ва ў правінцыі: 1) Бразэльскі, існуе ад 1932 г. (чэрвень), 2) Еўеўскі (Еў'е) ад 1933 г. (люты), 3) Гільвянскі ад 1933 г. (люты), 4) Мерычскі — 1933 г. (верасень), 5) Лункіскі — 1934 г. (студзень). У Коўне пры Т-ве існуе з 1932 г. жаночы аддзел. Т-ва мае тэатр і хор. У 1933 г. 1.IX пры Т-ве быў заснаваны дзіцячы сад. Дзякуючы недахопу сродкаў, сад праіснаваў толькі паўтара года.

Ад 1932 г. існуе „Беларускі Народны Унівэрсытэт“. Абшар дзейнасьці — ўся дзяржава. Пры Т-ве ёсьць таксама маленькая бібліятэка беларускіх кніжак. Т-ва рабіла спробы адчыненьня беларускіх школаў на правінцыі, аднак без пажаданага выніку, з прычын ад Т-ва незалежных.

Наагул, трэба адзначыць, што становішча бел. культурна-нацыянальнай справы ў Літве фактычна куды горшае, чым можна было б думаць выходзячы з факту існаваньня ўсіх успомненых установаў. Гэтага дзьве прычыны: 1) Адсутнасьць сродкаў і 2) недахоп культурных працаўнікоў.

Так ад дня заснаваньня Т-ва да 1.I.1936 г. агульны прыход Т-ва налічаў — 11.158 літаў 73 цэнты. Выдаткі за той-жа пэрыяд — 13.194 літы 29 цэнтаў.

Сяньня, агульны лік сяброў Т-ва — 318 чал. Даволі вялікі працэнт з гэтага ліку, зьяўляюцца сябрамі толькі намінальна.

Найбольш дае рэальнай працы Тэатр пры Т-ве. Так, у 1935 г. ім было пастаўлена: 12 спэктакляў у Коўне, 2 — у Еў'і, 1 — у Мусьніках, 1 — у Багасловішках, 1 — у Мерычах, 1 — у Ламперджах.

З другіх бел. арганізацыяў у Літве існуюць: „Беларускі Цэнтр у Літве“ і „Беларускі Нацыянальны Камітэт“. Апошняя, г. ё. „Б.Н.К.“ ёсьць фактычна прадстаўніцтвам, якое выбіраецца на год пры „агульных бел. зьездах Літвы“. Гэта новая ўстанова. Да гэтага часу дзейнасьці сваей яшчэ амаль не праявіла. Мэта ўтварэньня „Б.Н.К — абслугоўваць тыя інтарэсы бел. грамадзянства Літвы, якія не ўваходзяць у межы працы Беларускага Культ.-Асьветнага Т-ва, чыста культурнай арганізацыі.

„Беларускі Цэнтр у Літве“ — старая арганізацыя (існуе, здаецца, ужо з 1923 г.). Мэта — згрупаваць усю бел. інтэлігенцыю дзеля нацыянальнага і палітычнага самавыхаваньня, прапаганды бел. думкі сярод літоўскага ды й іншага грамадзянства, літоўска-беларускае супрацоўніцтва. З прычын існуючай варожасьці паміж „Б. Ц.“ і „Т-вам“, а таксама і „БНК“ гэтая арганізацыя („БЦ“) таксама цяпер існуе толькі намінальна. Ніякай грамадзкай працы не праводзе. Лік сяброў дужа абмежаваны.

—о—

== 25-цігодзьзе закладзінаў вышэйшай школы на Беларусі. У кастрычніку месяцу 1936 г. мінула 25 год ад дня адчыненьня на Беларусі вышэйшай школы: 27 кастрычніка 1911 г. у Віцебску адбылося „скромное, но знаменательное и великое не только для Витебской губ., но и для всего Белорусского Края торжество открытія Витебского Отделенія Московского Археологического Института“. („Витеб. Губ. Вед.“ 1911 г. № 238).

Пытаньне аб адчыненьні вышэйшай школы на тэрыторыі Беларусі падымалася ў друку яшчэ ў 1903 г. Потым яно абмярковывалася ў мястовых і земскіх установах Беларусі, дайшло да дзяржаўнай думы, да рады міністраў. Праектавалася тады адчыніць унівэрсытэт і сельска-гаспадарчы інстытут, але розныя перашкоды не далі зьдзейсьніцца гэтым плянам.

І вось тады Віцебская вучоная архіўная камісія зварочваецца ў Маскоўскі Архэолёгічны Інстытут з просьбай наладзіць у Віцебску чытаньне курсу лекцыяў інстытуту. Просьба гэта знайшла поўнае спачуваньне Маскоўскага Архэолёгічнага Інстытуту і яго дырэктара А. І. Успенскага, які сам некалькі разоў прыяжджаў у Віцебск для высьвятленьня гэтага пытаньня. Справа пайшла з такім пасьпехам, што 27 кастрычніка 1911 г. адбылося ўрачыстае адчыненьне Віцебскага Аддзелу, а на другі дзень пачаліся заняткі больш чым пры 80 слухачох; былі гэта, галоўным чынам, вучыцялі і чыноўнікі, якія цікавіліся старыной.

Як сам інстытут, так і аддзел яго ў Віцебску мелі два факультэты — архэолёгічны і архэографічны.

Лекцыі ў Віцебскім Аддзеле Маск. Арх. Інст. чыталіся, пераважна, пэрыядычна прыяжджаючымі з Масквы прафэсарамі інстытуту; з мясцовых сілаў чытаў лекцыі ведамы беларускі гісторык А. П. Сапуноў на катэдры беларускай гісторыі і старадаўнасьцяў.

Для назіраньня Віцебскім Аддзелам Інстытуту, у якасьці прарэктара яго, быў пастаўлены ў 1917 г. праф. Б. Р. Брэжго, які добра быў знаёмы з Беларускім Краем. (Б. Р. Брэжго ад 1925 г. жыве ў Латвіі, у м. Дзьвінску, дзе прадаўжае сваю навуковую працу: за гэты час выйшла з друку больш 50 яго навуковых працаў).

Надыйшоўшая сусьветная вайна не магла не адбіцца як на ходзе лекцыяў у Аддзеле інстытуту, так і на ліку яго слухачоў. У канцы 1916—1917 акад. году ў ім налічывалася ўсяго 38 чалавек. Але ад 1917 г. лік слухачоў пачаў узрастаць. Так, у 1917-18 акад. г. іх ужо было 69 чалавек. На 1 студня 1921 г. лік слухачоў дайшоў да 482 чалавек. Тлумачыцца гэта тым, што 1 лістапада 1918 г. інстытут быў перафар-

маваны з увядзеньнем у ім, па унівэрсытэцкаму прыкладу, чатырохгадовага курсу.

Паміж тым наезды з Масквы прафэсуры для чытаньня лекцыяў усё рабіліся больш цяжкімі. Таму апрача А. П. Сапунова і Б. Р. Брэжго, былі з мясцовых сілаў дапушчаны да чытаньня лекцыяў падгатаваныя Маск. Арх. Інст. навуковыя супрацоўнікі: — В. В. Дабравольскі, В. Мялешко, І. П. Фурман і А. О. Шлюбскі; былі ў гэтыя часы скамплектаваны бібліятэка, налічваючая да 36000 тамоў, музэй, габінэты — этнаграфічны, старадаўніх кніг, рукапісаў і г.д.

Але такая карысная праца Віцебскага Аддзелу Інстытуту ня доўга цягнулася: 30 чэрвеня 1922 г. была выдадзена пастанова аб ліквідацыі археолёгічных інстытутаў. У сувязі з гэтым зьліквідаваны быў Аддзел Маск. Арх. Інст. у Віцебску. Уся маемасьць яго была перададзена вышэйшаму пэдагогічнаму інстытуту ў Віцебску, а архіўныя матарыялы былі перададзены Віцебскаму аддзелу цэнтр. дзяржаўнага архіву Беларусі

Так скончыла сваё 11-цігадовае існаваньне карысная вышэйшая навучальная ўстанова на Беларусі.

— Беларускія паэты і кампазытары БССР працуюць над стварэньнем 6 арыгінальных беларускіх опэр і аднаго балету.

— Фольклёрнай Камісіяй Акадэміі Навук БССР, як ведама, у мінулым годзе быў праведзены конкурс на лепшага зьбіральніка фольклёру. У конкурсе брала ўчасьце 183 зьбіральнікі. Прыслалі яны больш 15.000 запісаў дарэвалюцыйнага і сучаснага фольклёру.

— У 1936 г. у БССР зарганізаваны 76 раённых архіваў. Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва БССР, дзеля паляпшэньня утрыманьня і захаваньня архіўных матарыялаў, арганізуе раённыя нарады дзелаводаў і сакратароў установаў.

— Ведамы мастак БССР Юры Майсеевіч Пэн згінуў трагічнай сьмерцяй на 80 годзе жыцьця ў канцы лютага ў Віцебску. Мастак нацыянальнасьці жыдоўскай. Сюжэт сваіх абразоў браў мастак пераважна з жыцьця жыдоўскай беднаты. Многа стварыў таксама пэйзажных абразоў. Мастак пакінуў багатую спадчыну — больш 800 глыбока рэалістычных твораў.

— У Маскве пачаліся заняткі дзяржаўнага ансамблю народных танцаў СССР. Мэта заняткаў — стварыць высокамастацкія ўзоры народнага танцу. З беларускіх танцаў пакульшто выбраны: „Лявоніха", „Крыжачок" і „Юрачка".

— Беларускі Інстытут пераліваньня крыві ў Менску сьвяткуе 5-годзьдзе свайго існаваньня. За кароткі час існаваньня, Інстытут арганізаваў у раённых цэнтрах БССР 20 філіяў. Працаўнікі Інстытуту выдалі 60 навуковых прац. Да юбілею выданы зборнік 20 прац — на тэмы пераліваньня і захворваньняў крыві.

— За заслугі ў галіне тэатральнага мастацтва артыстцы тэатру опэры і балету Л. П. Александроўскай Соўнарком БССР надаў годнасьць заслужанай артысткі БССР.

— Сэсія Акадэміі Навук БССР адбылася ў Менску 23—26.I, з учасьцем 150 акадэмікаў, прафэсараў і навуковых работнікаў. Сэсія выслухала справаздаўчыя даклады з дзейнасьці акадэміі ў 1936 г. і даклады аб плянах дзейнасьці ў 1937 г. Прызнана за нездавальняючую дзейнасьць інстытутаў гісторыі і літаратуры і мастацтва. Неадменны сакратар і сябра прэзыдыюму акадэміі, дырэктар інстытуту гісторыі акад. Шчарбакоў рашэньнем сэсіі зволынены са становішча.

— Соўнарком БССР у сваей спэцыяльнай пастанове аб разьвіцьці краезнаўчай і музэйнай справы ў БССР адзначае, што краезнаўчыя арганізацыі не спраўляліся з заданьнямі вывучэньня вытворчых сіл і прыродных багацьцяў БССР і не ўцягнулі ў краезнаўчую працу шырокіх працоўных масаў. Краезнаўчыя арганізацыі маюць быць пабудаваны паводле новай сыстэмы.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Хведар Ільляшэвіч — **Захварбаваныя вершы.** Вільня 1936.
Mykolas Biržyška — **Chodzka.** Коўна 1936.
„ „ **Chodkevičiai.** Коўна 1936.
„ „ **Chominskiai.** Коўна 1936.
Іван Огієнко — **Наука про рідномовні обов'язкі.** Жоўква 1936.
Навуковае Т-ва ім. Шэвчэнкі — **Праці географічной комісії,** вып. 1. Львоў 1935.
Записки чина св. Василія Великого, т. VI. Львоў 1935.
Ateneum Wileńskie. Вільня 1936.
Квартальник Вістника, кн. 1. Львоў 1937.
Рідна Мова, ч. 1, 2. Варшава 1937.
Назустріч, ч. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Львоў 1937.
Вістник, кн. 1, 2. 3. Львоў 1937.

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя ня мае ў сябе кніжкі першай „Калосься" з 1936 г. (усе экзэмпляры разыйшліся), дзеля чаго ня можа яе выслаць патрабуючым. Зварачваемся да В. П. Чытачоў з просьбай: калі хто можа, хай прышле нам першую кніжку „Калосься" з 1936 г. Узамен атрымае адзін экзэмпляр або два, (калі захоча) іншай кніжкі — з тых, што выйшлі з друку, ці з тых, што выйдуць.